Мужчына толькі што выйшаў зь яе, і стаяў, нахінуўшыся – яго чэлес, ярка-чырвоны, набухлы ад крыві, тырчэў, як палка. Цераз імгненьне ён ізноў увайшоў у яе – у шырока раскрытыя сьцёгны, некалькі разоў рухануўся, і застагнаў. Выліўся ў яе – зь яе пацякла белаватая вадкасьць, і далучыўся наступны. А потым яшчэ адзін. Усяго іх было пяцёра ці шасьцёра, яна не лічыла дакладна. Потым яны ўзьнялі яе, перавярнулі, і паставілі на карачкі. Яна не магла стаяць сама, і яе палажылі грудзямі на канапу, зьвесіўшы наперад рукі. Першы апусьціўся на яе ззаду, і ўвайшоў у яе ўлоньне, рухануўся некалькі разоў, і са стогнам сконьчыў ёй праміж ягадзіц, на сьпіну. За ім далучыўся другі, а потым трэцьці. Яны ўжо коньчылі па некалькі разоў, і нарэшце

насыціліся яе целам, і сваім юрам.

- Эй, вставай, красавица! Нехта прыўзьняў яе за плечы. Яна вярнулася ў цела, і застагнала. Ні стаяць, не сідзець яна не магла – дрыжэлі калені, акрываўленыя, сьцёртыя аб дывановае пакрыцьцё полу. Яе грудзі, плечы, сьпіна і жывот – усё было перапэцкана сьпермай. Сьперма вылівалася зь яе ўлоньня, цякла па сьцёгнах.

Яна са стогнам апусьцілася на падлогу, апершыся рукой на канапку, на якую лягла грудзямі.

- Ты что, целочка, красавица? Давай, давай. Вставай. Нехта рыўком узьняў яе.

- Одевайся давай. Иди. Хватит. Или ещё хочешь? Так нам отдохнуть надо. Мы так тебя не удовлетворим – подмогу придется звать. Хочешь, ещё мужики подъедут? Или как?

- Не. Яна пакачала галавой.

- Ну, тогда давай – быстренько. Нехта кінуў ёй доўгі папяровы рушнік для рук. Яна неяк прамакнула сьперму, якая яшчэ не засохла. Апранула сукенку – доўгую, вячэрную, завязала на шыі ленты банту.

- Ого, - вымавіў нехта, гледзячы на яе. – А ты – королева.

- Классная малышка. Молодец. Отработала. Так и скажи своему нарику. Он же у тебя нарик. Ты что, не знала? По коксу. Малышка-глупышка. Мужчына ўзьняў яе рукой за падбародак, і заглянуў ёй у твар. Сталы, вострыя блакітныя вочы, цёмныя кароткія валасы. Гадоў каля пяцідзесяці.

- Иди, девочка, и больше к нам не попадай, - вымавіў ён. – Не нужно это тебе. Такая хорошая девчонка, красивая. Мужика бы тебе хорошего. Жаль, мы тут все семейные. Жёны, дети. Нехта зарагатаў.

Збоч працягнулі ёй плашч, і яна захінулася ў яго. Туфлі на абцасах яна не здымала, яны так і былі на ёй увесь час. Але ж цяпер яна зразумела, што ісьці ў іх ня можа – калені дрыжэлі.

Зьняла іх, і панесла ў руцэ. Дзьверы расчыніліся перад ёй – чорная бездань, у якую яна правалілася, як дзіця ў сьвет з мацярынскага ўлоньня.

- Сонейка маё, анёлак мой, ты што? Што здарылася? Чаго ты? Чаго плачаш? Яна прачнулася ад таго, што громка плакала наўзрыд. Ён трымаў яе, прыціснуўшы да грудзей. Была глухая ноч. Яе калаціла ад плачу, горкага, быццам бы тое, што адбылося, здарылася зь ёй наўяве.

- Яны, яны згвалцілі мяне, - ледзь вымавіла яна праз сьлёзы. – Яны былі ўсюды, уваходзілі ўсюды, гэта за грошы, ён ім быў вінен. Я не жадала. Яна ізноў расплакалася.

- Хто? Што такое? Табе нешта прысьнілася? – запытаў ён, калышучы яе, як дзіця.

- Так, - каханы. – Страшны сон. Яна нарэшце супакоілася, зразумеўшы, што ўсё, што зь ёй адбылося, болей не адбываецца на яве. – Проста сон, але ж такі жудасны. Гэта толькі сон, каханы. Прабач, што абудзіла цябе. У цябе сёньня адказны дзень.

- Дзевачка мая, сёньня ў мяне – твой дзень. Сёньня я памру дзеля цябе, і ажыву дзеля цябе. Каб ты прабачыла мяне, бо я сам сябе не магу прабачыць. Усё, што адбывалася з табой – у гэтым ёсьць і мая віна. Чаму я не забраў цябе раней? Чаму не знайшоў цябе? Ён ахапіў яе рукамі. Яна маўчала. Ён таксама маўчаў, слухаючы, як ціха біецца яе сэрца.

Глава 14: Галгофа

- Я хачу гэта. Ты павінен гэта зрабіць.

- Не. Ніколі. Я - рэжысёр, а ня кат. На маей пляцоўцы ніколі не праліецца сапраўдная кроў. Я - пацыфіст, і супраціў усялякага гвалту, у любой яго форме. Тое - што ты хочаш, злачынства! І перад чалавекам, і перад Богам!

- Тое, што я хачу - праўда. А ты баішся праўды, і таму ніколі ня зможаш стварыць мастацтва. Падробкі пад яго, імітацыю - так. Мастацтва ж патрабуе крыві. Болю. Праўды жыцьця. Пакутаў. Ахвяры і ката. Так, як яно і адбываецца ў жыцьці. Як я змагу сыграць боль, калі мне ніколі не балела? Мяне ніколі не катавалі, ня білі бізуном, не прабівалі цвікамі. Хто я такі, каб іграць чалавека, які прыняў у сябе Бога?

- Распні мяне. Па-сапраўднаму. Пакарай мяне бізуном - так, як каралі яго. Колькі там патрабуецца ўдараў? Сорак? Херня. Калі я падохну, туды мне і дарога. Я і так у любы дзень магу памерці - на машыне разьбіцца ці ад п'янкі адкінуцца. Ды шмат чаго яшчэ можа здарыцца. Але ж вось - не здараецца. Усё жыву, як бачыш. Значыць, угодны я тут Богу, нешта я яшчэ не дарабіў на зямлі.

І калі ён забярэ мяне зараз такім чынам - гэта будзе яго воля. Разумееш? Ты ж вернік, як ты можаш пайсьці супраціў волі Бога?

- Волі Бога няма на тое, каб катаваць тваё цела. Паола вымавіў гэтыя словы, і замаўчаў.

- Ёсьць. На гэта ёсьць Мая воля. Гэта я загадваю табе - распні мяне. Не пярэч мне. Бо страшны лёс праклятых, тых, хто ідзе супраць мяне. Ён раптам выдахнуў, і спыніўся.

Паола з жахам глядзеў на яго.

- Вар'ят, - прамільгнула ў яго галаве думка. - Што ён кажа? Ён і

сапраўды лічыць сябе Богам.

Але ж разам з тым аднекуль глыбока, зь нетраў яго душы, у ім пачало ўзьнімацца спакушэньне. Нейкі вялікі зьмей быццам бы агортваў яго кольцамі.

- Зрабі гэта, - чуў ён нягромкі, шэпчучы голас - жаночы, мяккі, сумны. - Не пярэч. І замест славы зямной ты атрымаеш славу нябёсную.

- А калі ён памрэ? - разгублена вымавіў Паола, быццам бы самому сябе.

- Не памрэ. Ён набудзе жыцьцё адвечнае.

Голас раптам сьціх. Імгненьне ён стаяў, разгублены, быццам вагаючыся. А потым рашуча вымавіў:

- Я распну цябе, Мікеле. І загадаю перад гэтым даць табе сорак удараў, як ты і хацеў. Лічы, што я - Пілат. А ты - хай ты і Бог, але ж тут, на зямлі, ты дабравольна ў маёй уладзе, і тут я - твой Бог, і твой рэжысёр. Кіно раблю я, ты ж, Бог у плоці, тут толькі гулец. Памятай пра гэта.

- Вось і добра, - вымавіў ён. - Вось і пагадзіліся. Калі адбудзецца пакараньне?

- Зараз. Паола паціснуў плячыма.

- А што цягнуць? Увесь рэквізіт тут. І адлупцаваць цябе - пара дзялоў.

Шэра-белыя пад сьпякотным сонцам, у вечары і ў ранку сьцены Джыбелінны набывалі буйства колераў, ад сіняга да густа-ліловага, залатога і чырвонага, ствараючы сюрэалістычны пейзаж - эйфарыю дурнога сну. Заліты бетонам вар'ятам-мастаком горад праз намаганьні і арганізатарскі геній Паола, якія сапраўды нельга было недааценьваць, стаў лакацыяй, годнай найбуйнейшых тэатральных падмосткаў. Яны доўга блукалі па бясконцых лябірынтах вуліц, кіруючыся картай, якую ім перадалі ў мясцовым турыстычным бюро. Месца, дзе Паола хацеў здымаць пакараньне, месьцілася на перасячэньні

вуліц на ўскрайку былога горада, нагадваючых высахлыя рачныя руслы праміж бетонных кан'ёнаў, і само па сабе ўтварала крыж.

На гэтым бялюткім, з залацістым адценьнем бетонным крыжы усталявалі крэпкі драўляны слуп - абломак балкі, знойдзенай у навакольлі. Шурпаты і падраны часам, ён быў абламаны зьверху, і было страшна ўявіць тую моц землятрусу, якая магла яго рашчапіць і абрынуць.

- Пэўна, гэтыя бетонныя склепы ўтрымліваюць колькісь целаў, - падумалася яму, - якія ссыхаюцца пад імі, утвараючы пустоты. А можа, там нікога і няма, акрамя асыпаўшыхся камянёў. Але ж каму прыйшла на вум такая ідэя, і што было ў галаве гэтага чалавека - закансерваваць час?

- Пэўна, гэты горад быў дарагі яму, - вырашыў ён. Дарагі нечым, што было настолькі каштоўным, што патрабавала многіх тоннаў бятона і ўсясьветнае славы дзеля праслаўленьня гэтага, невядомага нікому, істотнага толькі для мастака Нешта.

Ці быў тое асабліва пранізьлівы захад, ці лазурная раніца ў дзяцінстве, ці зграя галубей, узьняўшаяся ў гару над крышамі, ад якой балюча забілася сэрца? Ці, можа, у адным з гэтых дамоў пад бятонам захавалася цень яго даўняга каханьня - якая-небудзь златакудрая Беатрычэ, якіх на сьвеце насамрэч не бывае. У кожнага з нас ёсьць свой горад - закансерваваны час, дзе пад тоўстымі слаямі каляровага бетону біецца жывое сэрца памяці.

Ён стаяў пасярод бялюткіх шурпатых сьценаў, якія разьбягаліся ад яго лябірынтам, і чакаў. Распрануты па пояс, у бруднай павязцы на сьцёгнах, пасьля тыдню ў вязьніцы, са зблытанымі гразнымі валасамі, якія адрослымі пасмамі падалі яму на плечы, зь няголенай барадой, чорнай, калючай, і такімі ж вусамі. Нічога ў ім не нагадвала таго прыгожага, дасканала выгаленага і прычэсанага Хрыста зь мяккімі хвалямі залатых валасоў і ўзьнёслым позіркам прыгожых блакітных вачэй. Яго вочы былі страшнымі, чорнымі ад пабоеў і стомы, вусны запякліся, шчокі ўваліліся - новая грымёрка пастаралася.

Сандра сышла невядома куды. Паола пра гэта нічога не казаў, і так яму было лепей. Усё ж, здарэньне зь ёй пакінула шнар ў яго памяці. Шлёндрай яна насамрэч не была, і сапраўды яго кахала. Толькі ён не кахаў яе, а кахаў іньшую, і таму шчыра ёй спачуваў. Але ж нічога ня мог для яе зрабіць.

Слуп перад ім выглядаў неяк неўразьліва, буднічна – старая дзеравяшка, да якой можна было б прывязваць коняў. А цяпер вось – прывяжуць яго. Зафіксуюць яго запясьці надзейна рэмнямі, прыцягнуць да жалезнага крука ўверсе, прывяжуць, як таго каня – жывёлу, якая пазбаўлена ўсялякае волі, і, як бы яна не намагалася, не парве вяроўку. Ды ён і не намагаўся яе парваць. Сюды прывёў яго Бог, дакладней – ён сам. Гэты слуп быў зараз нечым самым істотным у яго жыцьці. Веха, мільны камень – недзе паміж нараджэньнем і сьмерцю, якая мае быць не адбыцца менавіта з гэтага моманту. За гэтай вехай няма сьмерці – а ёсьць нешта невядомае, Бясконцасьць, у якую так страшна зрабіць крок. Раптам па яго сьпіне пабег пот. Ён не баяўся болю. А яго – гэтага невядомага, ён баяўся. Дужа важным для яго быў гэты крок, у ня-сьмерце. А калі і сапраўды ён набудзе адвечнае жыцьцё? Ці зможа ён вярнуцца зь яго за ёй? Ці ня згубіць яе ў нейкім новым, бясконцым пекле існаваньня-не-існаваньня? Але ж ён абяцаў ёй вярнуцца. І сюды ён не паміраць прыйшоў, а набыць жыцьцё адвечнае, а ня сьмерць – адвечную. Адсюль ён сыйдзе пераможцай. Ён заўсёды перамагаў. Бо ў яго не было іньшага выйсьця. Як ня будзе яго і цяпер. Ды і нічога страшнага тут няма – усяго толькі сорак ударaў пугай. Конь ці вол і ня столькі трываюць, і – нічога. А ён чым лепш, ці горш? Літоўскі бык. Ён успомніў яшчэ адну сваю мянушку. Колькі іх у яго было – і пад кожнай пакінуў ён супярэчлівую славу. Адное радавала – як хлуса ці труса яго ніхто не памятаваў – ні ворагі, ні сябры. Ён рашуча зрабіў крок наперад, да слупа, і працягнуў уверх рукі.

- Вяжыце, - коратка вымавіў. – Няма чаго губляць час. Яго ў мяне ня шмат.

Загудзела, запрацавала камера.

Да яго падышлі жаўнеры – насамрэч, памочнікі Паола, пераапранутыя ў рымскае адзеньне. Яго кісьці хутка зафіксавалі

ўверсе, і ён прысланіўся тварам да слупу.

Першы ўдар абрынуўся на яго – страшны, моцны, такі, якога ён не чакаў. Ён разумеў вумом, што гэта будзе балюча, і неяк праганяў ад сябе гэтую думку – ён жа мужчына, патрывае. Падумаеш, бізун. Яго цяглы сьціснуліся, сьпіна напружылася, стала нібыта каменнай. Мяса пераўтварылася ў адзіны плотны, пругкі слой, гатовы абараняць тое, што знаходзіцца пад імі, не шкадуючы сябе. Цела працавала само, яно ад яго болей не залежыла, як і ўдары бізуна, наступны зь якіх агарнуў пякучым полымем яго сьпіну, лізнуўшы і рэбры. Ён сьціснуў зубы, каб ня ўскрыкнуць, але ж яго выдах неяк сам пераўтварыўся ў глухі стогн – з такой моцай з-пад удараў бізуна вылятала зь лёгкіх паветра.

Удары сыпаліся на яго адзін за другім, і разам зь імі ў ім пачало прачынацца вар'яцтва. Яму хацелася зьнесьці, выдраць зь зямлі гэты слуп, разарваць тых, хто б'е яго, раскідаць на кавалкі, рычэць, як дзікаму загнанаму ў пастку зьвяру, як хапае колья і дзіды зубамі, страціўшы розум ад ахапіўшых яго болю і лютасьці. Адрэналін у яго крыві зашкальваў, і, можа, ён бы і вырваў з каранём гэты слуп, ці парваў рэмні, але ж усё гэта было не па сцэнарыю. І, галоўнае, гэта б азначала, што ён ня вытрымаў, ня здолеў выцярпець пакуты, якія там пакорліва пераносіў той.

Ён наогул не прывык цярпець. Ня ведаў, як гэта – скарацца. А цяпер яму прыходзілася. Ён дабравольна аддаў сябе на пакуты. І яму, чалавеку, гэта было агідна. А наколькі ж гэта было агідна Богу, які мог бы адзіным рухам ськінуць зь сябе гэты сусьвет, як надакучлівага мураша? Але ж Бог трываў. Таму будзе трываць і ён. Разам з болем яго ахапіла смага – страшэнная, бо сонца паліла ў самым зеніце, і разам з крывёю ён страчваў і ваду. Вадкасьць – кроў і пот – хутка пакідалі яго цела, і па сьпіне ўжо беглі не струменьчыкі, а цэлыя буйныя крыніцы, патокі, зьбіраючыяся ў чырвоную лужыну ля стопаў.

Раптам катаваньне спынілася – на імгненьне. Ён ужо не лічыў удараў, вырашыў, што так будзе лепей. Трэба было факусавацца толькі на болю – на ім адзіным, каб розум ачысьціўся ім, а праз розум – таксама і душа. Усё ж, у пекле пакараньні бясконцыя,

але ж і там душа працягвае думаць аб Богу. Бог сыходзіць у душу ў пекле праз боль, ён ёсьць Боль, і там ён міласьцівы і жаданы.

Аднак імгненьне цішыні ў пекле хутка абарвалася, і раптам яго сьпіну апаліў боль такі жудасны, што ён не стрымаўся, і ўскрынуў. А потым наогул ня стрымліваў ускрыкаў, якія пераўтвараліся ў нейкі роў звар'яцелага зьвяра. Рымская плець з уплеценымі ў яе кавалкамі жалезьзя біла па яго сьпіне, плячам, нагам, вырывая кавалкі з пасечанага бізуном цела, паглыбляючыся да самых костак, рассякаючы мышцы і жылы, робячы пакуты страшэннымі, нечалавечымі. Яму пашанцавала, што за яго бранёй мышцаў ня лёгка было прабіцца да костак ці глыбокіх нерваў і жылаў, але ж тое, ва што пераўтварылася яго скура, і мяса пад ёй, ён нават баяўся і ўявіць. Паола намерваўся нанесьці яму ўсе сорак удараў, як яны былі нанесены Хрысту. Пэўна, ён зусім страціў жаданьне прэзэнтаваць гэты фільм для шырокай публікі. Хто ж будзе на такое глядзець? Яго не дапусьцяць ні да воднага фестывальнага паказу. Няма такога рэйтынга, які мог бы абазначыць пакуты жывога чалавека, хоць і дабравольныя. Раптам яго накрыла думка:

- З самага пачатку Паола не жадаў удзельнічаць у паказах. Гэты фільм не прыназчаны для шырокай публікі. Біблейская гісторыя ў стыле снафф – жудасны рэалізм, фільм, у якім паказваюць рэальныя пыткі, і рэальнае забойства. Той, хто заказаў яму гэтае кіно, добра яму заплаціў, і зь цікавасьцю будзе назіраць, як будуць катаваць Мешыаха, які вазамніў сябе Богам. А можа, ён, гэты дзіўны глядач, жадае пабачыць, ці адбудзецца насамрэч уваскрошаньне. Як Бог у пасьмерці выглядае на крыжы? Ці рэальнае яго цела, альбо гэта толькі фантом, і сапраўдны Бог стаіць побач, і сьмяецца – і з самога сябе, і з глядачоў, і з катаў, і са ўсяго сусьвету, які нагадвае адную вялікую бязглудзую камедзію.

Ён сьціснуў зубы, і напружыўся ў апошнім намаганьні стрываць боль і дрыж цела, якое раптам стала яму непадуладным.

Але ж удары болей ня сыпаліся. Яны спыніліся.

Паола нячутна падыйшоў да яго. Разам зь ім – яшчэ нехта, хто,

нябачны, асьцярожна абцёр мяккай тканінай яго раны, і нанёс на іх нейкі спрэй – пэўна, з антыбіотыкам. Забіваць яго не зьбіраюцца. Нарэшце – пакуль. Навошта ён на гэта пагадзіўся? - Аддаў сябе ў рукі Богу, - адказаў ён сам сабе.

- Ты – Бог, Паола? – хрыпла вымавіў ён.

- Не, - адказаў той. – Ты – Бог. Я ж толькі дапамагаю табе асэнсаваць гэта.

- Хто цябе паслаў? – прахрыпеў, дакладней, прарычэў ён, намагаючыся парваць вяроўкі. Цяпер яму хацелася вызваліцца як мага хутчэй.

- Ён, - проста адказаў Паола. – Той, каго паслаў Бог. Бог паслаў яго да цябе, каб ты вызваліў сябе самога. Д'ябал папрасіў мяне зрабіць гэта. Той, хто абуджае душы, каб яны не паснулі, распальваючы вагонь пакутаў. Ты – дзіця Адама, адамант, крышталь, які адлюстроўвае ў сабе бясконцасьць. Разьбі сябе, Міхал. Хоць гэта і складана – разьбіць дыямант, аднак ты можаш. Ты гэта ведаеш.

- Дзе яна, - раптам яго голас стаў ціхім, быццам бы задушаным. – Што вы зь ёй зрабілі?

- Яна – тут. У бясьпецы. Ён нічога ня зробіць ёй. Ня мае права. Бо гэта павінен зрабіць ты сам.

Солнца зажглося атамнай ўспышкай, агромністым шарам памерам у сусьвет, і апаліла яго сваімі праменямі. Ён ляжаў на зямлі, на пыльным бетоне скрываўленай сьпіной. Нехта падлажыў пад яго белы кавалак палатна, на якім адпячаталася яго цела.

Здаецца, ён страціў прытомнасьць. Паола і іньшыя нахінуліся над ім, гледзячы заклапочана.

- Дзе яна? – прастагнаў ён.

- Яна – у вагоньчыку. Бо ж ты забараніў ёй глядзець. Я пакляўся табе, што яна ня ўбачыць тваіх пакутаў. Толькі на экране ў кіно, калі пажадае.

- Гэтае відовішча не для жанчыны. Ён слаба павярнуў галаву.

Раптам сабраўся, і сеў. А потым – устаў.

- Дзе крыж, Паола? Я гатовы. Кальварыя чакае Збаўцу.

- Нясіце крыж! – выкрыкнуў Паола громка, і неяк нават люта.

- Ты гатовы, збаўца? – кпліва асьведаміўся ён.

- Гатовы. Ён павёў скрываўленымі плячыма, распраўляючы суставы, пакруціў зацёклыя кісьці.

На яго накінулі нейкае рызьзё, хламіду, якая хутка прапіталася крывёю.

Патыбулум на плячы давіў, выклікаючы страшэнны боль у пасечанным целе, але ж ён ужо прызвычаіўся. Неяк яму стала ўсё роўна, і боль пераўтварыўся ў нешта звыклае, нават роднае і знаёмае. Раптам ён падумаў пра яе – як яна трывала боль. Для яе боль была нечым, што стварала істотную частку яе жыцьця. У яе часта нешта балела – галава, жывот, раз у месяц балеў жудасна. Яна магла ляжаць на ложку цэлы дзень, скурчыўшыся ў камочак. Яму было да сьлёзаў жалка яе, але ж яна слаба ўсьміхалася, і казала, што гэта нармальна – так яно ва ўсіх жанчынаў заўсёды. Страўнік балеў – давяла сябе сваімі дыетамі, нервамі і ванітамі. Тое, што для яго ў сэксе было адной асалодай, для яе было найперш і найбольш болем, хаця і асалодай – таксама. Усё жыцьцё яе нехта біў, ці гвалціў, ці – і тое і другое адразу. І ён – не выключэньне, хоць ён яе кахаў так моцна, што забываўся на самое сябе – нават і на тое, што ён - Бог. Яна прызвычаілася – і пачала жадаць гэтага, знаходзіць у гэтым нейкае хворае задавальненьне. Апынулася так, што гэта адпавядала яго жаданьню дамінаваньня і прычыненьня болю – у гэтым яны супалі, як і шмат ў чым яшчэ. Супалі так моцна, што зразумелі, што да гэтуль не існавалі, што былі паловамі аднаго вялікага цэлага, зьліліся так дасканала, што Ева ўвайшла назад – у рэбра, а Адам стаў сынам, і далучыўся да Айца. Ён казаў ёй не глядзець, але ж цяпер прагнуў, каб яна апынулася тут, зь ім побач. Яму раптам стала так блага і самотна, як ніколі. Быццам бы ён апынуўся адзін на сьвеце – як кінутае дзіця, якое

пазбаўленае мацярынскіх грудзей. Сэрца працінуў моцны боль, такі, быццам бы ў яго ўсадзілі дзіду. Ён нават спыніўся – і атрымаў бізуна, ізноў. Пахіснуўся, і ўпаў. Сам па сабе – так атрымалася. Камера наехала крупным планам – ён яе ня бачыў. У яго вачах пацямнела – сонца стала непераносна яркім. Раптам на сваім твары ён адчуў нечыя прахалодныя рукі.

Нехта прыкладаў да яго вільготную тканіну, праз якую ён ня мог бачыць, але ж ён адчуваў пах. Гэта быў яе пах, які ён ня зь кім не пераблытае. Ён адчуваў на сваім твары яе рукі, і лавіў іх вуснамі. Як цяпер яму была патрэбна яна! Болей, чым вада, болей, чым воля, і болей, чым самое жыцьцё. Ён нічога не жадаў, акрамя яе – абняць, прыціснуць да сябе, схаваць твар у яе на грудзях, і заплакаць – ад болю і жалю да яе, да самога сябе, і да сусьвету наогул.

Нарэшце, ён здолеў неяк узьняцца, і накрыў яе руку сваёй – яе маленькая кісьць апіралася на зямлю побач, і ён затрымаўся за яе, як за апошнія імгненьні пераходу ад жыцьця ў невядомае.

Яна глядзела ў яго твар вачыма, поўнымі болю, і нешта ціха казала – так, што немагчыма было пачуць. Праз шум марскіх хваляў у вушах ён адчуваў: “Ты – Бог. Каханы, я гэта ведаю”. Яе словы, ціхія, сталі раптам гучней за самы гучны звон, які толькі гучэў пад небам.

Яны разрывалі яго. Ён быў для яе Богам. А кім ён яшчэ мог для яе быць?

- Бог, любая, - ціха адказаў ён, гледзячы ў яе скажоныя болем вочы. – Я – Бог, каханая мая. І я ўваскросну. Ты ня плач. Я ўваскросну, і вярнуся да цябе.

Абяцаю.

Яе адцягнулі ад яго, а яго ўзьнялі – груба, штуршком падкінулі, і паставілі на ногі. На сьпіну палажылі патыбулум, і ён, прыгнуўшыся, крочыў наперад. Астатні шлях даўся яму ўжо неяк проста, так, што было не цікава.

Ніхто не дапамагаў яму – ніякага Шымона-кірынеяніна. Ды і

народу наогул вакол было няшмат. Вузкая вуліца не давала сабрацца натоўпу – толькі жаўнеры, і ён, і невялікая кучка рушыла і гаманіла ззаду.

Так жа нештмалюдна апынулася і на Галгофе. Неяк буднічна яны палажылі патыбулум на зямлю, прыбілі перакладзіну да крыжа, а потым ён сам па загаду лёг на дзеравянны брус, раськінуўшы рукі. Кісьці крэпка прыматалі вяроўкамі, як і стопы. Ён ляжаў, і глядзеў у неба. Неба было высокім і чыстым. На ім плылі аблокі. Сьпіна ўжо не балела – гарэла, быццам бы на ёй смажылі яго самога. Удар молатам па цвіку ў далоні абудзіў яго, але ж боль быў хоць і моцны, аднак пераносны. Аднакратны рэзкі боль ад удару, працінуўшы далонь. Другая далонь рэфлекторна зжалася, адгукнуўшыся на стук молату.

Цвікі не былі вялікімі – ці то Паола пашкадаваў яго, ці то каб не разарваць далонь. Ён чытаў, што прабівалі запясьце, аднак яно было туга перакручана вяроўкай – няма куды там было гэты цвік убіць. Таму, усё ж, далонь – адзначыў ён пра сябе.

Наступныя два ўдары – па стопах, усё ж вырвалі зь яго грудзей крык – глухі паўкрык-паўстогн.

Вось і ўсё. Катаваньне сконьчылася – цяпер павінна была надысьці сьмерць. Крыж узьнялі, і ён апынуўся высока над натоўпам. Стаяў, раськінуўшы рукі, і глядзеў удалёчыню над галовамі. Ён увесь быў пакрыты сьпечанай крывёй і пылам, рукі і ногі дзіка балелі ад кожнага руху, добра, што ён стаяў на драўлянай прыступачцы, да якой яго стопы былі прыкалочаныя цвікамі. Стаяў надзейна – так і сапраўды можна прастаяць некалькі дзён, пакуль не звар'яцееш ад смагі і болю, ад чарвей, скрабучыхся ў ранах, якія ядзяць цябе нажыва, ад мухаў, і крумкачэй, якія абдзіраюць твой чэрап, паглыбляюцца клювам у вантробы. Аднак крумкачэй варта настойліва адганяла – яны маглі забіць хутка. Таму пакуты на слупе з разьцягнутымі рукамі пад пякучым сонцам паступова пераўтвараліся ў нешта непераноснае.

Сонца паліла, неба было чыстым, і Бога ў ім не было. Ён апынуўся некім накшталт рабоў Спартака – проста злачынца, асуджаны на сьмерць, які абавязкова пакутніцкі памрэ, раней,

ці пазьней – гэта як пашанцуе. Тры дні. А на трэці дзень ён павінны ўваскроснуць.

Як там было па сцэнару – ён павінен быў выкрыкнуць: “Зьдзейсьнілася!”, і павесіць галаву на плячо. І раптам ён зразумеў, што так хутка ён не памрэ. Ніякага “зьдзейсьнілася” ня будзе. А будзе жахлівая доўгая пытка пад палячым сонцам, калі ў выніку ён звар’яцее ад пакутаў.

Дзіда ў бок цяпер здавалася яму міласэрным падарункам.

Ён апусьціў позірк – яна стаяла ў натоўпе. Маленькая фігурка ў чорным, з распушчанымі валасамі, зблытанымі, запыленымі, зьліпшыміся ад яго крыві. Стаяла, і моўчкі глядзела на яго вачыма, вялікімі ад яго болю.

- Я ж тут дзеля цябе, - хацелася яму выкрыкнуць ёй, але ж раптам ён зразумеў, якое глупства зрабіў. Ён не павінен быў даць сябе схапіць, даць сабе памерці. Стаць жывой іконай, учалавечаным Богам. Ён жыць быў павінен, жыць, ня гледзячы ні на што, дзеля яе. Дзеля свайго народу, дзеля ўсяго сусьвету. Ён столькі яшчэ не сказаў, у ім засталося столькі ведаў, не пераданых людзям. І што, што ён стаіць тут, прывязаны? За якія-такія грахі? Чыі? Даў сябе схапіць, і цяпер вісіць тут, як падла. А яна – там, унізе. Ян абдымае яе – Джаваньні. Ён атрымаў гэтыя бумагі: аналіз. Прачытаў, і сунуў у кішэню. Нагрудную. Ён заўсёды гэта ведаў. Ведаў, што так яно і ёсьць. Сусьвет пакаціўся колам перад яго вачамі. Ён страсянуў галавой. Летыцыя! Яго вусны варухнуліся. Яму казалася, ён вымавіў пра сябе, але ж атрымалася ўслых. Яна кінулася да слупа.

Паола зварухнуўся.

- Зьнята! – нарэшце выкрыкнуў ён. – Здымайце! Хопіць, Мікеле! Ты ўваскрос! Хопіць пакутваць! І табе, і нам усім.

Ён казаў ёй не глядзець, але ж яна глядзела. Глядзела ўвесь час, хаваючыся ў натоўпе за сьпінамі людзей з камерамі. Кожны ўдар бізуна адгукаўся болем у яе целе, быццам бы гэта білі па ёй самой. Яна да апошняга ня верыла, што яны гэта зробяць –

зробяць фільм сапраўдным. З усімі пакутамі так, як яны адбываліся насамрэч. Думала, будзе нейкі хітры грым, але ж зразумела – так ня зробіш, не сыграеш. Толькі праўда годная называцца тым, што завецца мастацтвам. Казалі, што Мікеланджела забіў дзеля праўды раба. Цяпер яна верыла, што так яно і было. Што значыць лёс чалавека перад вечнасьцю вобраза? Тленнае саступае ідэальнаму, вяртаючыся да першавытоку формаў. Кожны ўдар бізуна па целу быў мастацтвам. Кожны яго глухі стогн, ускрык, уздрыг яго плоці. Мастацтвам было самое жыцьцё. Сусьвет быў велічным палатном, на якім разгортвалася драма жыцьця і сьмерці. Ёй хацелася наблізіцца да яго, але ж яна не магла. Стаяла ў глухой адзіноце сярод натоўпу, і паўтарала паўшэптам – адзін, два, тры … Так яна далічыла да трыццаці, а потым бізун зьмяніўся на плець зь металічнымі кавалкамі-джаламі. Яго сьпіна, ногі, плечы пераўтварыліся ў сапраўднае месіва з крыві і мяса. Брызгі крыві даляталі нават да яе, яна бачыла іх на сваіх руках, адчувала на губах.

І ў той жа час, разам з болем яна адчувала гонар. Яна ганарылася ім – тым, што ён здолеў зрабіць гэта. Што ўсё сваё жыцьцё ён жыў так, як зараз – не шкадуючы сябе, паліваючы ўласнай крывёй кожнае палатно свайго жыцьця, аддаючы сябе поўнасьцю, з жарсьцю, усяму, што ён рабіў, да вар'яцтва, да апантанасьці. Так, як ён кахаў яе – не шкадучы ні яе, ні сябе, руйнуючы, каб абудзіцца разам.

- Госпадзі, прабач грахі сыну твайму чалавечаму, - ціха шаптала яна. – Увайдзі ў яго, узьнімі яго, напоўні яго сабой, і прыцягні мяне праз яго да сябе.

На шляху да Кальварыі яна здолела да яго прабіцца, і абцерці твар вільготным рушніком, які цяпер, скамячаны, трымала ля сэрца. Тканіна хутка высахла, і на ёй застаўся адбітак яго твару, і яна прыціскала яго да вуснаў.

Калі яго прыбівалі, яна закрыла вочы, бо разумела, што яе розум ня вытрымае, і яна канчаткова скоціцца ў бездань вар'яцтва, зь якога ёй ня будзе выйсьця. Яе хвароба давала аб сабе знаць – яна разумела, што не была здаровая. Сабой, нармальнай, яна станавілася толькі калі пісала. І калі была

разам зь ім. Астатнія часы ж пераўтвараліся для яе ў нейкую бясконцую чаргу трызьненьняў і працверажэньнеў, якія былі толькі фазамі трызьненьня.

Перш за ўсё, яе турбавалі ўспаміны. Яны рабіліся ўсё больш дэтальнымі, катавалі яе, залівалі, затаплялі, набывалі плоць і кроў, і паўставалі вакол, намагаючыся адгарадзіць яе ад усіх, і нават – ад яго. Толькі ён не даваў ім – выціскаючы стары боль новым. Яна зь нейкай вар'яцкай радасьцю жадала ад яго ўсё большых зьдзекаў і катаваньняў, якія станавіліся для яе больш жаданымі, чым віно для прапойцы, бо яны спаталялі смагу яе душы. Ён катаваў яе праз любоў – а тыя яе не кахалі. І цяпер усё тое, што яна рабіла для іх, яна жадала рабіць для яго. Так, і нават болей, значна болей, бо сапраўды яе адданасьць яму была бясконцай. А яшчэ – яна ведала. Папера выпала зь яго кішэню, калі яна разьвешвала адзеньне – разарваны канверт з адрасам клінікі. Яна паглядзела, і ціха паклала яе назад. Нічога цяпер не было істотным. Вакол яе грымеў навальнічны гром. Яе розум быццам бы працаваў на ўсе сто адсоткаў загрузкі сваіх магчымасьцей. Яна бачыла з усіх бакоў, і чула ўсе магчымыя і немагчымыя галасы. Галасы д'ябальскія, і галасы анёльскія. І ўсе яны казалі ёй аб ім – адзіным, хто быў тут дзеля яе, быў тут – зь ёю. Хто цяпер узьняўся дзеля яе на крыж, і хто дзеля яе пакутваў.

Яна стаяла, і глядзела на яго, неадрыўна, быццам бы яе позірк мог перадаць яму нешта, нейкую моц, якая і сапраўды магла б ажывіць яго.

Яна ня бачыла, як яго вусны варухнуліся, але ж яго голас яна пачула.

- Летыцыя!

Гэта прагучэла так нечакана балюча і разгублена, быццам бы яе клікала ў лесе згубіўшаеся дзіця. Забыўшыся на ўсё, яна кінулася да гэтага слупа. Што будзе далей, яна ня ведала, і не жадала ведаць. Ці гэта было па сцэнарыю, ці мела гэта нейкі сэнс наогул. Ёй было ўсё роўна – ён клікаў яе, і яна прыйшла. Яна ахапіла слуп рукамі, пацягнуўшыся да яго ўзьнятым тварам.

- Я тут, каханы, - ціха вымавіла яна. – Я тут. Ці ты чуеш мяне? Ці ты мяне бачыш? Яна не магла дацягнуцца да яго, бо яго ўзьнялі недасяжна высока, але ж і адсюль, зь зямлі, ён яе пачуў.

- Дзяўчынка мая, - вымавіў ён. Яго вусны ледзь рухаліся. – Нічога ня бойся. Я сыйду да цябе. Сьмерці няма, каханая. Я – Бог, і я гэта ведаю.

- Зьнята! – пачуўся голас Паола. І ў апошняе сваё імгненьне на дрэве, перад тым, як яму спусціцца, ён убачыў – далёка за сьпінамі і галовамі прысутных, крыху далей і ніжэй на пагорку, ня бачная зьнізу, стаяла высокая постаць у чорным, у худзі, закрываючым твар. Быццам бы адчуўшы яго позірк, чалавек узьняў галаву, і адкінуў зь яе капюшон.

Мілаш. Ён пазнаў яго адразу – па постаці, па росту, па шырыне плечаў і сьветлым валасам, коратка пастрыжаным, крыху зачэсаным на бок. Нацысцкі паўбокс. Стылёвая дрэнь. Падкрэсьліваў сваё белае “арыйскае” паходжаньне, у адрозьненьне ад чарнамазых дзікуноў-варвараў, якіх трэба было ўсех вынішчыць, да адзінага, вычысьціць ад іх сьвятую зямлю. Тое, што варвары былі адной зь ім крыві і з аднаго народу, яго не спыняла, бо ж іх жанчыны запэцкаліся, валяючыся з туркамі, і цяпер гэту брыдоту, на яго мяркаваньне, было ўжо не адмыць. Таму да жанчынаў, асабліва чорнавалосых, смуглявых, ён быў асабліва нялітасьцівы. Чуткі аб яго зьдзеках і злачынствах множыліся па ўсім краі. Успароць жанчыне жывот, выцягнуць у яшчэ жывой маці плод з чэрава, расьпяць голай, паліць вадой на марозе, а потым – абліць бензінам і падпаліць – гэта называлася “пагрэцца”. Чаго толькі не было ў тых расказах. Не было толькі аднаго – галоўнага, чаго ніхто ня ведаў, бо Мілаш не пакідаў сьлядоў сваёй жарсьці, насалоджваючыся ахвярамі бяз рэштку. А любіў ён плоць. Зразаць яе з касьцей яшчэ жывой пакутніцы, насалоджваючыся яе крыкамі, акуратна, каб не пацарапаць косткі, зразаць мяса вакол грудзей, пакідаючы часткова толькі твар, саскі, і похву, да якіх ён прынікаў вуснамі, валодаючы скрываўленым целам, пакуль яно было яшчэ жывым. Каб ахвяры не гублялі прытомнасьць, ён калоў ім морфій і адрэналін, бо любіў спатольваць сваю жарсьць зь целам цёплым, і рухаючымся,

уздрыгваючым, курчыўшымся ад болю. Некрафілам Мілаш ня быў, і, як толькі атрымоўваў сваё, паліваў цела бензінам, і спальваў, бо не жадаў, каб пра яго забавы ведалі яго людзі. Усё ж, жорсткасьць мае свае межы, і нават сярод апошніх з апошніх не знайшлося б тых, хто трываў бы побач такую істоту.

І цяпер ён відавочна быў тут – дзе была яна.

Ён глуха застагнаў. Вялікая лесьвіца ўзьнялася, і па ёй ўзьняўся чалавек, які асьцярожна пацягнуў пласкагубцамі зь яго рукі вялікі цвік. І тут ён ня вытрымаў – сьвядомасьць, нарэшце, яго пакінула.

Ён бязвольна павіс на вяроўках, і калі ачуняў, то ўжо ляжаў унізе, і яму ў твар пшыкалі ваду. Далоні і стопы яго былі перавязаныя, цела накрытае чыстай прасьцінай.

- Як ты? – заклапочана запытаў Паола.

- Нармальна. Ён ледзь вымавіў гэта патрэскаўшыміся вуснамі.

Яна нахінулася над ім, углядаючыся яму ў твар. Яе валасы, шаўкавістыя, доўгія, ліліся на яго, як вада жыцьця.

- Запэцкаешся, - ціха вымавіў ён, у той жа час праводзячы бруднай, скрываўленай рукой па яе твары.

Яна ўзяла яго далонь, і прыціснула да вуснаў.

- Усё ж, я не памёр! – ён усьміхнуўся.

- Бог ня можа памерці, каханы, - прашаптала яна, цалуючы яго руку. – Бо ж ты – Бог, і я гэта ведаю.

Глава 15: Адам

- Пакуты не узвышаюць. Не набліжаюць душу да Бога. Чалавек пераўтвараецца ў жывёлу, Джаваньні. У самае горшае, што ён можа ў сабе знайсьці. А потым прыходзіць адчай. І страх сьмерці. Здаецца, што гэта - ўсё. І знаешь, Джаваньні, што найбольш страшна?

Страшна ў гэты момант памерці.

Ён памаўчаў, і працягнуў:

- Памерці жывёлай. І вось калі надыходзіць гэты страх: што ты - жывёла, і ты зараз памрэш, за ім раптам прыходзіць думка. Што ты - не жывёла. Ты - чалавек. І сьмерці наогул няма. Бо ты, чалавек, роўны Богу. Бог і ёсьць Адам. Сын чалавечы гэта і ёсьць Бог. Бог паслаў у чалавека самога сябе, і стаў ім. Жывёла зьнікла. Бог у табе, і яе няма болей. Разумееш? Няма нічога жывёльнага, калі чалавек прыняў у сябе Бога. І ўсё тады становіцца сьвятым. І юр - каханьнем, і віно - крывёю. І жанчына становіцца Шхінай. Ты проста бачыш праўду. Усё вакол - гэта суцэльнае сьвятло. Ты паміраеш радасным, разумееш? Пераўтвараешься ў яго. Гэта і ёсьць Укрыжаваньне, і Ўваскрошаньне. Расьпяцьце на крыжы цела, і нараджэньне Душы ў Богу. Там, па-за межамі сьвету.

Я яго знайшоў, Джаваньні. Я - Бог. І ты - Бог. Бог - кожны, хто адкрыў яго у сабе, увайшоў у гэтыя дзьверы.

- Якія адчыніў табе боль, - удакладніў Джаваньні.

- Не, Джаваньні. Дзьверы ўжо былі адчыненыя. Ніякіх замкоў на іх няма. Проста каб дасягнуць іх, трэба пераступіць праз страх. Увайсьці ў вогненнае мора, і перасеч яго. Гэты агонь спальвае цела, і жывёла ў табе гіне. А потым чыстая душа дасягае Бога. Становіцца перад ім, і разумее, што між ім і ёй наогул няма адлегласьці. Уваходзіць у яго, і набывае яго якасьці, не губляючы самое сябе. Яна нібыта сябе памятала - заўсёды. І ў той жа час яна - ён.

- А сусьвет? Хто стварыў яго? - запытаў Джаваньні.

- Бог ня мае датычаньня да сусьвету. Сусьвет стварыў Д'ябал. Як і цела чалавечае - жывёльнае. Бог жа ўвайшоў у яго са сваёй вялікай літасьці. Бо ж ён бачыць, і ведае ўсё.

- А хто тады стварыў Д'ябла? - Джаваньні глядзеў на яго ўважліва, пільна, працінаючы вагнём чорных, як вар, вачэй.

- Д'ябла ніхто не ствараў. Ён паціснуў плячыма.

Ён узьнік сам па сабе. Саманароджаны. Самаэль. Гэта нешта, што зарадзілася ў цемры Хаосу, і выйшла зь яго, каб процістаяць сьвятлу.

Д'ябал - князь і творца сусьвету, у якім мы знаходзімся, і адначасова яму не належым. Кожны, хто прымае ў сябе Бога, супрацьстаіць сусьвету. Супрацьстаіць Д'яблу. Гэта адкрыў, і гэтаму вучыў Шымон. Гэта прапаведваў Мані. Зараастрыйцы амаль зразумелі гэта. Толькі Бога - ня два. Ён - адзін. І ён - ня творца, ня Бог Торы, Старога Запавету. Бог Торы - Элахім, анёлы - якія суць дземаны, бо ў кожнага зь іх два твары. Аднак у Торы насамрэч гаворыцца аб Богу сапраўдным, тым, хто гаворыць праз прарокаў, якога не чуюць, бо блытаюць з богам-творцай, які ня ёсьць Ён. Шымон надта добра ведаў Тору. Лепш, чым хто іньшы. Яго нельга было злавіць на слове, на няведаньні. У Торы гаворыць Бог, аблічаючы і адкрываючы свой твар, які разбурае гэты сусьвет. Тора гаворыць аб Мешыаху. Яна яшчэ ня ведае Бога сапраўднага. Да Мешыаха зямля блукае ў цемры. І народ іўдэйскі блукае ў пустцы, створанай Д'яблам, памерам з сусьвет. Блукае і прагне Бога. Кліча яго. Бо ён ведае, што ён ёсьць. Пробліскі ідэальнага Бога, як сьвятло ранішняга сонца, працінаюць нябёсы. Іх бачыць Піфагор, бачыць Платон, бачыць Грэцыя і Егіпет. Бачуць на Ўсходзе, дзе сонца пачынае свяціць найбольш ярка. Усе на зямлі адчуваюць на сваім твары сьвет Бога. Бог ня можа не сьвяціць, як ня можа не сьвяціць сонца, калі яно ўзышло, і пачынае разганяць цемру.

І тады агнец пераўтвараецца ў Сына, а ахвяра ўзьнімаецца да Айца.

- Ведаеш, Джаваньні. Ён ізноў памаўчаў. - Там, на крыжы, я маліўся ёй. Маліўся ёй сапраўднай. Я ня клікаў Бога. Я клікаў яе. Пра Бога наогул ня думаў. Я проста вымавіў яе імя. Ня "зьдзейьнілася", не. Я паклікаў яе, як дзіця кліча сваю маці. У ёй было жыцьцё, і ключы, і шлях, і брама, і мост праз вогненае возера. Гэта яе я ахвяраваў самому сябе, і ўзьняўся да сябе праз Сьвяты Дух - дым ад яе гарашчай плоці. Яна - неапалімая купіна, баранак і анёл, Шхіна, і маці, і Ева, і тая, хто спакушае на сьвятасьць. Я ня мог памерці. Ня мог пакінуць яе. І таму не памёр. Гэта яна стварыла для мяне мост сабой. Праз яе цела, яе ахвяру я перайшоў да Бога. Гэта яе я ушаноўваў, разрываючы яе плоць, і пазбаўляючы цела, вызваляючы з плоці яе душу. Ён закрыў твар рукамі.

Джаваньні моўчкі глядзеў на яго.

Калі ён убраў рукі, яго позірк быў страшным.

- Гэта я - ён, Джаваньні. Я - сам Мілаш. Сам - забойца. Разумееш? Гэта я забіваў іх усіх. Я баюся самога сябе, і сам цкую за сабой. Як гэта магчыма?

- Ня ведаю, Мікеле. У сьвеце яшчэ шмат таямніцаў, якія нам мае быць разбачыць у промнях боскага сьвятла

Джаваньні паціснуў плячыма.

- Але ж я бачыў яго. Бачыў яго з крыжа. Ён стаяў, і глядзеў, як мяне ўкрыжоўвалі.

Ці я трызьніў ад болю і смагі?

- Я б быў асьцярожным, Міхал. Пакуль што чалавека, якога ты лічыш Мілашам, бачыў толькі ты. Ды і чаго ты вырашыў, што Мілаш Фёдара і Мілаш з твайго мінулага - адныя і тыя ж людзі? Гэта - распаўсюджанае імя. Да таго ж, Мілаш зь мінулага - ты яго ня бачыў таксама. Ты ж толькі пра яго чуў. Ці ты сустракаўся зь ім калісьці?

Я сустракаўся зь ім у Пізе. Гэта быў першы раз, калі я яго пабачыў. А там, на вайне, я бачыў целы. Расьпятыя целы

маладых жанчынаў. Людзі казалі, што гэта ён. І ён цкаваў за мной. Мне казалі, ён пакляўся мяне адыскаць. Адбылося так, што мяне ўбачыў і запомніў адзін з палонных, які нейкім дзівам выжыў. Цяпер я шмат чаго разумею. І не разумею яшчэ болей.

- Джаваньні, калі я рабіў усё гэта - я, наогул, не чалавек. Яго вочы, пустыя, страшныя, глядзелі на яго.

- Ты - не чалавек, Мікеле. Цяпер ты - Бог. Мешыах. Хрыстас. Чалавек застаўся ў мінулым. Такім, якім ён быў. І якога даўно ўжо насамрэч не было. Бо тое, што ты творыў, чалавек творыць ня мог. Ты ж сам кажаш.

Мікеле, паслухай. Ты яшчэ слабы. Гэтыя раны, укрыжаваньне, цяплавы ўдар - усё гэта паўплывала. Цябе трэба адпачыць. Можа, зьвярнуцца да якога доктару, паразмаўляць зь ім, каб ён назначыў табе рэабілітацыю. І гэты чалавек, кім бы ён ня быў, якога ты бачыў - я займуся ім. Прасачу вакол. Ты можаш быць спакойны за яе. Мае людзі будуць ахоўваць яе і дом у дзень і ў начы. - Як там нашыя справы, дарэчы? - запытаў ён, пераходзячы да тэмы, дзеля якой яны і сапраўды сустрэліся.

- Справы - добра. Паступіла яшчэ некалькі замоваў. Яны і сапраўды вырашылі распачаць гэта. Столькі зброі ня можа не выбухнуць.

- Гэта надоўга. Джаваньні нахіліў галаву.

- Да, Джаваньні.

Да цябе прыйдуць канверты - два. Ён назваў імя. - Гэта будуць мае заказы. Падпішы, і адным пакетам можаш пераслаць мне.

- Колькі? - запытаў Джаваньні.

- Мільёнаў па сто чыстымі. Кожнаму з нас.

Джаваньні кіўнуў.

- Ня блага. Слухай, гэта добрыя грошы, каб уладкавацца, Мігеле. А можа, табе б падумаць а сапраўднай сям'і? Жанчына ў цябе ёсьць, чаму б не завесьці зь ёй дзяцей? Для нас сям'я - усё,

Мігеле. Дзеці - гэта анёлы. Яны ўгодныя Богу, і, можа, выкупяць нашыя грахі. Калі не дададуць новых. Раптам ён зарагатаў.

- У мяне самога засталася толькі сястра. Брата, старэйшага, забілі. А сястра выйшла замуж і з'ехала. Жыве ў Нью-Йорку.

Я б пагуляўся зь немаўлём. Стаў бы хростным. Чэсна. Ваша дзіця будзе прыгожым, як анёлак.

Летыцыя - жанчына дзіўнай прыгажосьці.

- Я не магу, Мікеле. Ёсьць абставіны. Мы зь ёй ня можам мець дзяцей. Ён апусцьціў пяцярню ў валасы, закрыў рукой твар.

- Чаму? - зьдзівіўся Мігеле. - Калі нешта ня так, цяпер усё магчыма. Медыцына робіць сапраўдныя цуды.

- Ня ў гэтым справа. Ёсьць нешта іншае. Ён пакачаў галавой. - Джаваньні, мне дастаткова яе. - Яна - маё дзіця. Я кахаю яе, і да іншага я не гатовы. Ды і наогул - паглядзі, куды коціцца гэты сьвет. Не хачу прыводзіць сюды яшчэ адну душу на пакуты. Па крайняй меры, пакуль.

- Гэта ведае толькі Бог, Мікеле. Якая душа прыйдзе, і куды. Ты ж тут ня ўсёведаючы. Джаваньні хлопнуў яго па плячу.

Глава 16: Таро

- Летиция, помнишь, мы с тобой договаривались насчёт сеанса? Ну, таро? Ты тогда расплакалась, и я обещала посмотреть тебя дома, только я вот подумала, что лучше будет, если бы мы встретились. Тогда карты точнее работают. Ну, связь с инфополем более чистая. У тебя как настроение? Все хорошо?

Карына адкінулася на сьпінку пашарпанай скураной канапкі, якая стаяла ў невялікім бялюткім пакойчыку. Вакно, адзінае, было таксама і балконнымі дзьвярыма, за якімі каваны разны балконьчык быў увесь увіты вінаградам. Балконьчык вісеў над маленькім дворыкам-калодзежам, цемнаватым, мошчаным, застаўленым гаршчкамі з кветкамі. Тут было ціха і паўцёмна, і ёй падабалася – не магчыма нават і параўнаць з хостэлам, дзе яна дзяліла пакой з яшчэ адной дзяўчынай, афрыканкай з доўгімі касічкамі і моцным мускусным пахам нямытага цела, ад якога яе ванітавала.

На тым канцы памарудзілі, а поты мяккі, ціхі, крыху сумнаваты голас адказаў:

- Дзякуй за клопаты, Карына. У мяне ўсё хораша. Мы толькі што вярнуліся дамоў, ездзілі па справах. А потым Міхась хварэў, але ж цяпер усё добра.

- А что с ним такое? А куда вы ездили? Так можно к тебе приехать, или нет, я не поняла? Карына адразу выдала тры пытаньні, і спынілася, чакаючы адказу. Круціла рукой, і вывучала, як сонечныя зайчыкі скочуць на каменьчыках на пазногцях. Карэйскі манікюр. Новы зрабіла. Яна задаволена ўсьміхнулася, і апусьціла руку.

- Так, канешне. Калі хочаш, прыязжай.

- А он дома? – чамусьці пацікавілася яна.

- Міхась? Ён паехаў па справах. Будзе позна вечарам. Так што я адна, ня бойся.

- А я и не боюсь – ещё чего, - ледзь ня вымавіла яна. І раптам зразумела, што зь яе душы проста камень зваліўся. Каго-каго, а гэтага яе мужыка ёй сустракаць зусім не хацелася.

- Страшный он какой-то. Стрёмный. Чёрный весь, глаза эти – как угли. Нет его, и очень хорошо. Тем более, что она не просто так едет, а по делу – на разведку.

Раптам яна адчула сябе Матай Хары. Прыгажун-бландзін папрасіў яе аб дапамозе, і, пэўна ж, шчодра аддзячыць. Яго нумар тэлефону ў справачніку– Мілаш – вабіў яе, і яна раз-пораз адкрывала яго, каб паглядзець на лічбы.

999 333 666

Лёгка запомніць.

- Хорошо, приеду! Жди, через полчаса.

Яна хутка ўзьнялася, накінула на шорты з майкай туніку-кімано, узяла сумачку-падробку Versace, надзела туфлі на высокіх таўстых каблуках – барбі-дол, і зьбегла па лесьвіцы. Паймала на вуліцы таксі, і праз паўгадзіны ўжо стаяла перад варотамі вілы. Націснула гузік званка, назвалася, і ёй адразу адчынілі – чакалі.

Яна прайшла па цяністаму, абсажанаму апельсінавымі дрэвамі двару, і ўзьнялася на высокі ганак, упрыгожаны ільвамі і калёнамі, з шырокай пляцоўкай-верандай. Дзьверы перад ёй бязгучна раз'ехаліся, і, памарудзіўшы імгненьне, яна зрабіла крок у прахалодную цемру.

Вялікае лобі, як заўсёды, паўцёмнае, прахалоднае, быццам бы ня мела межаў – сьцены з'ядаў паўзмрок, які панаваў тут з-за густога ценю расьлінаў зімовага саду за процілеглым вакном. Гаспадарка ўзьнялася з канапы – лёгкая, як цень анёла, у нечым тонкім і бялюткім, паўпразрыстым, зьліваючымся зь яе белай, як малако, скурай. Яе чорныя валасы вольна ляжалі па плячах, і Карыну зьдзівіла іх дліна і гушчыня – да поясу, як чорны бліскучы плашч, покрыў, закрываючы вузкія плечы.

- Дзень добры, Карына! – ціха вымавіла яна. Яе голас быў гасьцінны і зьвінеў, як маленькія срэбныя бубеньчыкі.

- Праходзь, калі ласка. Мы можам зрабіць усё тут – на гэтым стале. Я нават і сьвечы прыгатавала. Ты ж любіш сьвечы? Яна падышла да яе, і правяла да канапы.

Яна была басанож: лёгкія аксамітныя тапачкі-балеткі ляжалі на падлозе - яна забылася апрануць іх. Яе стопы, маленькія, белыя, з малочна-пярлінавым лакам педыкюру, былі памерам ня болей за трыццаць шосты. Але ж сама яна была высокай – ростам з Карыну, якая ўзьнялася на абцасы з платфомай.

На ёй была апранутая лёгкая паўпразрыстая шыфонавая сукенка с завязкамі на таліі, зь мяккімі валанамі вакол шыі і на манжэтах, а таксама – унізе, з-пад якой быў бачны кароткі шаўкавісты топ, і маленькія шорцікі з такой жа тканіны.

- Мы падобна апрануліся, хоць і не дамаўляліся! – зьдзіўлена-задаволена вымавіла яна. – Якое ў цябе прыгожае кімано!

Карына адцягнула і паправіла палу. Чорны шоўк зь яркімі паўлінамі – купіла на кірмашы ў нейкай палатцы з адзеньнем у багемскім стыле.

- Да, спасибо! Мне тоже нравится! – вымавіла яна задаволена.

- Их продавала настоящая цыганка! Такая чёрная, страшная. Прямо как твой … ой, прости, не хотела тебя обидеть, - выбачылася яна.

- Нічога. Сядай сюды, калі ласка. А я запалю сьвечы. Хочаш кавы? – запытала яна яе. – Альбо – віна? У мяне ёсьць чырвонае – адкрытая бутэлька.

- А давай – вина! – вымавіла Карына, махнуўшы рукой. – Говорят, что карты не любят спиртное, только я не верю. Какая разница! Главное – связь с инфополем. И ещё – настройки. У меня есть настройка таро, настройка на архангелов, и на астральный мир. Поэтому информация всё равно пойдёт. А вино её только ускорит – отпустит сознание.

- Недавно я практиковала астральное путешествие, - вымавіла яна, адпіваючы з келіху.

Гаспадарка запаліла чорныя сьвечы – нізкія шырокія прамавугольнікі, і пакой напоўніў прыемны салодкі водар.

- Я принесла очень сильную колоду – «Золотое путешествие в астральный свет». Она работает с солнечными энергиями. Сейчас мы с тобой отправимся …

- Прабач, а можна, я прапаную табе выкарыстаць іньшую калоду? – раптам запытала Летыцыя.

- Другую? А какую? У тебя есть карты? – Карына сапраўды зацікавілася, і цяпер глядзела на яе, адкрыўшы рот.

- Ёсьць, - ціха вымавіла яна. - Толькі не ў мяне. Гэта калода Міхася. Ён падарыў мне яе, але ж я яе яшчэ не выкарыстоўвала. Ён сам работаў зь ёй некалі. Даўно. Ён ня часта дастае карты. Я бачыла толькі пару разоў. Я іх не кранаю – ён забараніў. Ды вось гэтую кранаць можна. Гэта клясычная калода – Райдер-Уэйт. Ты яе ведаеш.

- Конечно, знаю. Карына ўсьміхнулася.

- Ты знаешь, сейчас уже столько новой информации, что тарологи не работают с такими простыми колодами. Но если ты хочешь, я, конечно же, использую её. А потом мы проверим её по моим картам. Они подключены настройками к астралу, и информация по ним идёт очень точная, не сомневайся. Так будет ещё интереснее.

- Давай, сейчас мы проверим, какие вокруг нас находятся энергии? Я считаю твоё биополе, и, может, мы что-то в нём увидим – то, что требует коррекции. А потом поработаем с этим.

- Давай. Яна кіўнула.

- Ты ведаеш, мне часта сьняцца дрэнныя сны. Мяне турбуе мінулае. Я б жадала вылячыцца ад яго. Ачысьціцца, толькі ў мяне не атрымоўваецца. Я ня ведаю, як. І я не жадаю яго

турбаваць. Ён цяпер праходзіць праз свае выпрабаваньні, і яшчэ слабы. Яна задумалася. – Я адчуваю, што яму патрэбная мая падтрымка. Я так кахаю яго, Карына. Здаецца, я гатовая аддаць за яго жыцьцё! – раптам вымавіла яна, і замаўчала.

- Вот как? Ну, сейчас посмотрим. И на него, и на тебя, - хацела дадаць яна, але ж чамусьці стрымалася.

- Сейчас я дастану из колоды три карты, и мы всё увидим. Давай сюда своего Уэйта.

Летыцыя моўчкі працягнула ёй калоду – новую, з чорнымі, аксамітнымі на вобмацак рубашкамі з ледзь заўважным цісьненьнем. Абрэз калоды нагадваў старую кнігу – крыху жаўтаваты. Карты былі новымі, пругкімі, і прыемна лажыліся ў руку.

Яны ляглі ў далонь Карыны, быццам бы яе чакалі, і яна раптам адчула іх цяжар, і гарачыню. А яшчэ – холад. Нечакана ёй стала страшна.

- Хто ты? – запытала яна, і быццам бы не пазнала свой голас. Перамяшала калоду, зьняла, і палажыла на чорны паліраваны столік карту рубашкай наверх – прама на адлюстраваньне чорнага полымя, якое адбівалася у паверхні сталу.

Летыцыя прама глядзела на яе, і яе вусны быццам бы ўсьміхаліся. Яе тварык, мяккі, сьветлы, у абрамленьні доўгіх чорных валасоў, нібыта не належыў гэтаму сьвету.

- Почему она такая белая? Совсем на солнце не выходит? – запытала Карына самое сябе. – Странная какая-то, и всегда была странной. Дурочка. Что я тут делаю с ней? Деньги зарабатываю. И выполняю поручение, - выправила яна самое сябе.

- Ну, вот, сейчас посмотрим, какие вокруг тебя энергии, - вымавіла яна. – И на него посмотрим, - дадала яна пра сябе.

Працягнула руку, і перавярнула карту. Перад ёй на чорным стале ў бліскучым коле з полымя чорных сьвечаў ляжаў Д’ябал.

Яна ўзьдрыгнула. Неяк гэта было прадказальна, і - нечакана. Ва ўсіх яе раскладах карты лажыліся страката, так, што патрабавалі шмат талкаваньняў, вывучэньня кніг і форумаў. Што можа значыць дзясятка кубкаў з Калесьніцай і перавёрнутай васьмёркай кубкаў пры двойцы мячэй і двойцы жэзлаў? Нешта накшталт. Тут жа яна адразу палучыла адказ на сваё пытаньне – і такі, што па яе сьпіне пабег халодны пот.

- Слушай, подруга. Не знаю, как тебе и сказать. Только мужик твой – вот. Я, ты извини, про него спросила. Кто он? Кто рядом с тобой. И – видишь что. Ты его боишься? – раптам запытала яна. – Дьвол, вообще-то, означает страхи. Или ты просто чего-то боишься? Давай посмотрим дальше.

Ёй, і сапраўды, стала цікава.

- Я не баюся яго. Я яго кахаю.

- Давай дастанем яшчэ дзьве карты, - прапанавала яна. – Дай мне калоду. Яна працягнула руку, і Карына, як зачараваная, дала ёй чорныя карты рубашкамі наверх. Яна імгненьне трымала іх у руцэ, накрыўшы далоньню, а потым наўздагад выцягнула зь іх адну карту, і палыжала рубашкай наверх на стол. А потым дастала яшчэ, і яшчэ адну.

- Яны хочуць, каб я утварыла крыж, - ціха вымавіла яна. – Чорны крыж. Ты ведаеш, што гэта такое, Карына? Гэта – калі расклад вядзе Д'ябал. Які ёсьць наш сапраўдны Бог – уладар сусьвету. Я ведаю яго – ён гаворыць са мною. Ён кажа мне, што ён – Бог, і што ўсё вакол – гульня, і нічога не істотна. Акрамя нашага зь ім каханьня. Глядзі. Яна перавярнула карту зьлева і зьнізу ад першай. Перад ёй на чорнай паверхне сталу ляжала Жрыца. Яна кіўнула.

- Гэта – я. Я – Шхіна, і я стаю пры браме. Яна нахінула галаву. А гэта – тое, што адбудзецца. Яна перавярнула другую карту – справа. Перад зьдзіўленымі вачыма Карыны з'явіўся шкілет на кані – Сьмерць.

- Дарога, - патлумачыла Летыцыя. – Бо ж сьмерць – гэта толькі шлях. Шлях да яго. Калі мы пераадолеем свае страхі, ён

пераўтворыцца ў Бога.

- І яшчэ – апошняя карта. Малькут, выснова і пасланьне. Яна перавярнула карту ўнізе, у аснаваньні крыжу.

Перад імі ляжаў перавёрнуты Маг – павержаны. Увесь расклад выглядаў болей чым злавесна – з Д'яблам наверсе, Жрыцай і Сьмерцю па баках, нагадваючы і сапраўды нейкі д'ябальскі крыж, ці, дакладней – праклён.

- Прабач, Карына, але ж ты – ня вельмі ўдалы маг. Сьцеражыся. І ты гуляешся зь Д'яблам.

Яна прама глядзела на яе вялікімі сьветла-шэрымі вачыма. Яе вусны звычайна ружовыя, мяккія, нібыта запякліся крывёю.

- Я – не маг. Я – эзотерик. Карына рашуча пацягнула руку, каб зьмяшаць карты, але ж Летыцыя раптам перахапіла яе кісьць.

- Не чапай. Я сама. Яна акуратна сабрала расклад, і злажыла карты назад у калоду. Перамяшала, і паклала ў аксамітны чорны мяшочак, які ляжаў побач.

- Ён – Д’ябал. Не Бог. Ты кахаеш Д’ябла, і тым самым наклікала на сябе адвечны праклён. Ты зь ім у пекле, і сама не заўважаеш гэтага. Але ж катаваньні будуць рабіцца ўсё больш і больш жахлівымі па меры таго, як ты будзеш рухацца зь ім далей.

- Гэта не істотна. Яна пакачала галавой. Ён жа заўсёды будзе са мной побач?

- Так. Ён будзе. Ён кіўнуў галавой.

- Якія вы, жанчыны, дурныя. Ёй здалося, што ён успыліў, што было нечакана.

- Вы заўсёды абіраеце таго, хто катуе вас. Зьдзекваецца над вамі. Вас і сапраўды трэба біць. Гвалціць. Зьневажаць. Рэзаць на кавалкі. Іньшага каханьня вы не разумееце. Яно будзе здавацца вам прэсным. Слабым. Толькі той, што прычыніць вам найболш пакутаў, заслугоўвае ў вашых вачах найбольшага каханьня. Чаму ты не знайшла прыстойнага хлопца, не стварыла зь ім сям'ю, не нарадзіла яму дзяцей? Я ж упэўнены, такі быў.

Яна пакачала галавой.

- Быў. Проста ты яго не заўважала. Усё жыцьцё ты марыла толькі аб адным – маньяку і забойцы. Аб Д'ябле. Ты аддавалася яму яшчэ ў дзяцінстве. Д'ябал прыходзіў да цябе, і трахаў цябе, і ўжо тады ты атрымоўвала ад гэтага нечалавечую асалоду. Ты так прагла яго, што ён прыйшоў наяве. Д'ябал учалавечыўся дзеля цябе – так ты яго кахала. Раптам ён закашляўся.

Яна наліла вады ў кубак, і працягнула яму. – Папіце, - ціха вымавіла яна. Ён машынальна ўзяў стакан. Яго рука была цёплай. Жывой, чалавечай рукой. Яна скамянела. Ён жа, здаецца, гэтага не заўважыў. Адпіў, і вярнуў стакан ёй.

- Хочаце яблыка? – яна працягнула яму плод.

- Яблык? – Ева, ты спакушаеш мяне. Хочаш, каб я адкусіў ад забароннага плоду?

- Можа, і так. Ня бойцеся, ён смачны. Яна ўзяла вялікі чырвоны плод, і ўлажыла ў яго руку. Яе маленькая белая рука крыху памарудзіла на ім, але ж яго рукі болей не кранала.

- Дзякуй за яблыка. Ён палажыў яго ў кішэню. – Пакіну напотым.

- Чаму вы прыйшлі сюды? – запытала яна яго.

- Каб цябе папярэдзіць, - адказаў ён. – І каб пераўтварыць яго

жыцьцё у пекла. Тваё ж і так ужо ім з'яўляецца, і цябе мне шкада.

- Закрый вочы, - загадаў ён ёй.

Яна падпарадкавалася, і пачула, як ён адчыняе ваду у ваньне. Вада палілася гучна, з абодзьвух кранаў.

З хвіліну яна сядзела так, слухаючы, як ванна напаўняецца вадой. Хутка ручайкі зь яе пачалі вылівацца, і пабеглі да яе ног. Яна не ўставала, адчуваючы, як па падлозе ўжо бяжыць сапраўдная рака. Хутка вада даберацца да лесьвіцы, сьцячэ па ступеньках, і пабяжыць струменьчыкамі да мора.

З-за дзьвярэй пачуліся галасы, шум крокаў. Нехта ўвайшоў у пакой, потым – у ванную. Нехта схапіў яе за руку.

- Што ты тут робіш? Што здарылася? – пачула яна яго голас, які поўніўся сапраўдным жахам.

- Вада, - прашаптала яна. – Яна закалыхала мяне. Я, пэўна, паснула. І адчыніла вочы.

Ён ахапіў яе рукамі, прыцягнуўшы да сябе. З кранаў капалі кроплі – ваду перакрылі зьнізу.

Яго касьцюм намок, яе ногі таксама былі мокрымі, вада дабралася да яе стопаў, намачыла пеньюар, карункавы шлейф якога, намоклы, ляжаў на падлозе.

- Золатка маё … як ты мяне напалохала. Што з табой такое? Ты зусім бледная. Ён устрывожана глядзеў на яе, трымаючы яе твар рукамі.

- Я бачыла яго. Мужчыну, бландзіна. Ён прыходзіў сюды. Ён гаварыў са мной. А потым сышоў.

- Як? Куды прыходзіў? – ён, здаецца, не паверыў таму, што пачуў.

- У ванную, - ціха адказала яна. – Ён адкрыў ваду.

- Золатка, гэта не магчыма. Дом прасматрываецца. Усё зачынена – вароты, дзьверы. Ніхто б сюды не ўвайшоў, ня маючы чыпа для разблакіроўкі. Варта маніторыць тэрыторыю, і дом. Толькі гэты пакой не прасматрываецца, ну і ванная таксама. Гэта праўда. Але ж як ён мог трапіць сюды, мінуючы двор, калідор, лесьвіцу? Зь верталёта апусьціўся? Аднак гэта зусім не магчыма. Нават калі б яго з парашутам сюды ўкінулі. Сонейка, ты проста сон бачыла. Ён прытуліў яе да сябе.

Ізноў твае сны. Яны, пэўна, ужо падмяняюць табе жыцьцё. Ты пацярпі яшчэ крышчаку. Мы з'едзем адсюль. Паедзем у Егіпет. Куды захочаш. Толькі патрымай яшчэ нямнога.

Можа, табе доктар трэба? Можа, якія таблеткі табе папіць? – ён пагладзіў яе па валасах.

- Ня ведаю. Я нічога ня ведаю, любы. Толькі ты мяне не пакідай, і ніякія таблеткі мне ня будуць патрэбныя. Яна абняла яго за шыю.

Ён узьняў яе на рукі.

- Пайшлі, сонейка, высушышся, пераапранешся. А потым я пабуду з табой. Нікуды сёньня не паеду. І ты ўсё мне раскажаш, што цябе хвалюе. Каб ніякія чужыя мужчыны да цябе адной не прыходзілі. Ні ў яве, ні ў снах.

Яна пераапранулася ў сухое, і ён зьнёс яе ўніз па лесьвіцы ў лоббі: на ступеньках яшчэ была вада. У нізе таксама стаялі лужыны. Некалькі чалавек з персаналу адышлі ў бок, і стаялі, пазіраючы на іх. Ваду прыйшлося адкачваць – анучкамі ня выцярэш такі патоп. Нехта прашаптаў нешта на вуха другому. Хтосьці ледзь заўважна пакачаў галавой.

Ён павярнуў галаву ў іх бок, і коратка кінуў:

- Прэч адсюль.

- Сонейка маё, я захіну цябе ад усіх, - прашаптаў ён ёй. – Нікога і нічога ня бойся, пакуль ты са мною.

Глава 20: Калі немагчымае магчыма

- Ты не пакінеш мяне, каханы? – ціха запытала яна, абдымаючы яго.

- Ніколі, любая.

Яны сядзелі разам у вялікім шэзлонгу. Дакладней, ён сядзеў, а яна ляжала ў яго на руках, адкінуўшыся, выцягнуўшы ногі. Мяккае сонца залівала яе белую скуру залатым сьвятлом. Вакол іх сьхіліліся духмяныя апельсінавыя дрэвы. Было ціха, і прыгожа, як у раі. Недзе ў гэтым раі, праўда, хаваўся зьмей, трымаючы атручаны плод, але ж яны яго не заўважалі – ён іх не цікавіў.

Ён гладзіў яе доўгія ногі, ад сцёгнаў і далей, якія ляжалі ў яго на каленях.

- Прыгожая, - ціха вымавіў, гледзячы на яе. – Бялюткая, і танюткая, як лялька. Яна глядзела на яго – у сонечным сьвятле з-за яго сьпіны яго твар выглядаў яшчэ смуглейшым, цямнейшым з-за барады і вусоў. Чорныя валасы ахіналі яго, і сонца сьвяціла праз іх, распадаючыся на мноства танюткіх залатых праменьчыкаў.

- Ты – прыгожы, - ціха вымавіла яна.

- Што мы робім тут з табой, каханы? – раптам запытала яна яго. – Як мы апынуліся на гэтай віле? У гэтым дзівосным садзе – як у раі? Няўжо гэта і сапраўды рай, і мы вярнуліся сюды? Бог болей ня гневаецца на нас, любы.

Ён нахінуўся, і пацалаваў яе.

- А мы нікуды адсюль і не сыходзілі, каханая. Мы тут былі адвечна. І застанемся тут, пакуль ён нам не надаесьць, і я не разбуру яго, каб пабудаваць нешта іньшае, больш годнае

нашага каханьня. Нават і рай абмежаваны. Я ж хачу кахаць цябе бязь межаў. Навошта нам рай, ці пекла? Мне ніхто, акрамя цябе, не патрэбны. Там, дзе ты – там усё. І рай, і пекла. І гэтага мне дастаткова. Толькі кахаць цябе, трымаць цябе на руках.

- Ты – праўда мой айцец? – ціха запытала яна.

- Я – Бог, - адказаў ён. – А гэта значыць, што я – твой айцец, любая. І хопіць болей пра гэта. Як ты вызначыш роднасьць паміж кахаючымі душамі, акрамя таго, што яны з'яднаныя каханьнем? Ці ёсьць яшчэ якая мера памераць іх? Толькі веліччу каханьня вымяраецца душа. Душа Бога – бясконцая, бо ён можа кахаць бясконца.

- А мая душа? Яна бясконцая, ці канечная? – запытала яна яго.

- Твая – бясконцая, бо ты можаш кахаць Бога, - ціха адказаў ён, гладзячы вялікай рукой яе валасы.

- Той, хто можа адказаць каханьнем, роўным боскаму, на Яго бясконцае каханьне, і сапраўды ня мае межаў, як і сам нябёсны айцец. Ты ж прыйшла да мяне, любая. Адзінае, што ня можа зрабіць Бог, гэта вымусіць душу прыйсьці да яго. Ён можа проста чакаць. Кахаць, і пакутваць у самоце. І вось на яго парозе з'яўляецца яго ўлюбёная душа. Яго Шхіна. Ці ты можаш уявіць Яго найвялікшую радасьць?

Яна ўсьміхнулася ў адказ.

- Магу, - ціха вымавіла яна. – Гэтая радасьць і сапраўды бясконцая.

- Што казаў табе гэты чалавек? Які з'явіўся невядома адкуль, і невядома куды сышоў? – спакойна запытаў ён.

- Ён казаў мне, што ты забіў тую дзяўчыну, якая расьпятая вісела на крыжы за вакном. І што ты хочаш забіць мяне. Што ты – ня Бог, а Д'ябал, - адказала яна. Яе вочы прама глядзелі на яго, быццам бы прасьвечвалі яго наскрозь.

- А што ты адказала яму, сонейка? – запытаў ён. Яго голас нават і ня ўздрыгнуў. Рукі ўсё так жа мякка дакраналіся да яе

сьцёгнаў, пагладжваючы.

- Я сказала, што кахаю цябе, і астатняе для мяне не істотна. Нічога не істотна, акрамя нашага каханьня.

- А калі б я і праўда забіў бы тую дзяўчыну, любая? Ты б не баялася мяне? Хацела б ты і далей заставацца тут са мною? – запытаў ён. Яго голас быў сур'ёзным, і ў ім гучэў несхаваны боль.

- Не. Я б цябе не баялася. А дзяўчыну гэтую забіў ня ты, каханы. Яе забіў Бог. Яна накрыла яго руку сваёй. – Ці можа чалавек пазбавіць другога жыцьця? Гэта не магчыма, любы. У чалавека няма такой волі. Не чалавек дае жыцьцё, і не ён яго забірае. Толькі Бог можа пазбавіць жыцьця чалавека. І на ёй ён явіў свой прысуд – літасьцівы і справядлівы.

А чалавека гэтага я бачыла і праўда, каханы. Яго рука была цёплай. Я дакранулася да яе, калі дала яму стакан вады.

- Стакан? – запытаў ён. – А дзе гэты стакан, сонейка?

- Стаіць на століку ўверсе. Там жа, дзе і стаяў. Яна паціснула плячыма.

Ён узяў тэлефон, і набраў нумар аховы.

- У ванну не заходзіць, нічога там не кранаць. Праз хвіліну будзь ў лобі.

- Пайшлі, любая. Хачу паглядзець на той стакан, - спакойна вымавіў ён.

Яны ўзьняліся па ступеньках, і хутка прайшлі ў ванную. Стакан, невялікі, тонкі, з рэшткай вады на дне, стаяў на туалетным століку.

Негрыцянка-прыбіральшчыца забілася ў кут побач. Яны ледзь пасьпелі: яна ўжо працягнула да яго руку, і ў жаху аддзёрнула яе, пачуўшы крык:

- Ня зь места!

Кіраўнік аховы падыйшоў да яго.

- Сіньёр Мікеле, усё добра. Стакан тут, і яго ніхто не кранаў. Я прасачыў.

- Пасьвяці. Яны задзёрнулі шторы, падыйшлі да століку, і ахоўнік накіраваў на шкло ультрафіялетавы луч. На баку стакана быў выразна бачны адбітак мужчынскай рукі – вялікі палец, і астатнія насупраць. На краі меўся адбітак вуснаў.

- Ты са стакана ня піла, золатка? – запытаў ён яе.

- Не. Ён быў чысты, - ціха вымавіла яна, і закрыла ліцо рукамі. Раптам яна расплакалася – гучна, наўзрыд. Усе стаялі, скамянеўшы. У ваннай усталявалася цішыня.

- Як. Ён. Прайшоў сюды? – ціха, страшна запытаў ён.

- Гэта не магчыма, сіньёре. Кіраўнік аховы спакойна глядзеў на яго. - Мы сачылі за ўсімі хадамі і выхадамі. Усе запісы ёсьць, сіньёре. Вы самі можаце іх прагледзець.

- Але ж ён тут быў. Адбітак на стакане. Гэта не яе вусны, і не яе рука. Хтосьці браў яго з вас?

- Не. Ніколі мы нічога не бярэм у вашым пакоі, сіньёре. Гэта выключана.

- Калі прынесьлі стакан? – запытаў ён у прыбіральшчыцы.

- Учора вечарам я паставіла чысты, - ціха адказала яна.

- Ноч і раніца, - задумліва вымавіў ён.

- Каханая, ты сапраўды бачыла … чалавека? – зьвярнуўся ён да яе.

- Так. Яе трэсла, як у ліхаманцы. – Гэта быў ня сон, не фантазія. Ён быў тут. А калі сыходзіў, сказаў мне зачыніць вочы, і адкрыў ваду.

- Каб яна ня чула, як ён выходзіў, сіньёре. Тут недзе павінны быць ход, - спакойна адказаў ахоўнік. – У гэтых старых дамах шмат таямніцаў, сіньёре.

- Каму належыў дом раней? – запытаў ён. Яго голас ізноў набыў спакой і палохаючую, халодную моц.

- Ён належыў сям'і Гамбіна, сіньёре. Дакладней, сіньёру Джаваньні, як яе галоўнаму спадчыньніку. А потым ён прадаў вілу рускаму, сіньёр. Ад якога яна перайшла вам. Я даўно працую тут, сіньёр. Яшчэ з часоў бацькі сіньёра Джаваньні. Але ж ніколі я ня чуў пра нейкія таямнічыя хады ў ваннай. Прабачце, сіньёр.

Ён дастаў тэлефон, і набраў нумар.

- Джаваньні, слухай. Мілаш быў тут. У мяне ў ваннай. Як? А я адкуль ведаю. Летыцыя бачыла яго. Размаўляла зь ім. Не. Не фантазіі. Ён пакінуў на стакане сьляды – вусны і рука.

Трэба прабіць па базе. Хай пашукаюць, толькі – не афіцыйна.

- Прыедзеш? Зараз? Чакаю. Ён абарваў сувязь.

- Усем сыйсьці. Ты застанься, - зьвярнуўся ён да кіраўніка. – Трэба агледзець сьцены.

- Сіньёр, тут цягне ля пола! Нарэшце, ахоўнік выпраміўся. Джаваньні, які толькі што ўзьбёг па лесьвіцы, і ўвайшоў у пакой, нахінуўся да яго. Ён стаяў за імі ззаду.

- Цягне? Пачакай. Ён націснуў рукой на сьцяну. Нічога. Націснуў яшчэ раз, і яшчэ. Раптам панель павярнулася, і ён ледзь пасьпеў аддзёрнуць руку, каб не зваліцца ў праём.

Перад імі адчынілася чорная, як калодзеж, дыра. Паветра зь яе ішло сухое і чыстае, быццам бы ёй карысталіся зусім нядаўна.

- Я ня ведаў. Я сапраўды ня ведаў пра гэта. Ніхто ня ведаў. Джаваньні разгублена глядзеў на яго.

- Дайце мне, сіньёре. Ахоўнік ськіваў сьвятло ліхатырка ў праём. Яны апусьціліся па ступеньках, і хутка стаялі ў садзе сярод пастрыжаных і прарэжаных ружовых кустоў, аглядаючыся.

- Хто ў цябе ўзяў адпачынак, Мікеле? Здаецца, у цябе была тут нейкая яшчэ жанчына на кухні. Нешта я яе даўно ня бачыў. Джаваньні раптам усьміхнуўся – страшна. Яго вочы былі халоднымі, як лёд.

- Ружы. Некалькі дзён таму яна ўвесь пакой, і ванну нам ружамі заставіла. Назразала. Я яшчэ падумаў, зь якой нагоды. Толькі значэньня не прыдаў. Ён паматаў галавой, разшпільваючы ворат кашулі.

- Мы яе знойдзем, Мікеле. Дзе б яна не была. Я табе абяцаю, і дня ня пройдзе. Калі яна не схавалася, як крыса ў нару, пад гэтым домам. Тут, я гляджу, і сапраўды шмат сурпрызаў.

Ён набраў нумар.

- Вінчэнца? Так. Я. Паглядзі мне аднаго чалавека. Як яе завуць? Марыя … ён назваў фамілію, імя па бацьку і нумар пачпарту.

- Што? Мяжу не перасякала? Добра.

- Недзе яна тут. Не зьдзіўлюся, што нават і Пізы не пакідала.

- А чаго ёй хвалявацца. Яна ж мяркуе на работу прыйсьці, пэўна. Думаю, яе роля ў гэтай камедыі яшчэ ня скончана. Зараз праверым. Пачакай.

Ён набраў нумар.

- На другім канцы адказалі амаль адразу.

- Марыся? – запытаў ён. – Чым займаешся?

- Да так, ничем. Голас у трубцы, нейкі сонны, зьмяніўся на зацікаўлены.

- А что такое?

- Ды нічога. Справа да цябе ёсьць. Сустрэцца з табой хачу. Буду ў горадзе праз гадзіну.

- Я через час не смогу. Я занята. Да, у меня личная жизнь. Извините. Давайте, завтра. Завтра я могу уже выйти.

- Ну, выходзь. Я буду чакаць. Ён адключыўся.

- Прасачылі званок? – запытаў ён.

- Да, тут, у горадзе. У жылым кварталы.

- Адпраў па адрасу машыну, і хай даложаць, калі ўбачаць чалавека. Высокі, сьветлы, у камуфляжных штанах, накачаны, на руцэ шнар. Мяркую, што яна не адна, - вымавіў ён, гледзячы на Джаваньні. Той марудна кіўнуў.

- Каханая, мы тут з табой сёньня да вечара пабудзем. Толькі як ён на тэрыторыю трапіў? – запытаў сам сябе.

А потым здагадаўся.

- Яе чып. Праверце, ці здала яна яго. Праз хвіліну зьбялелы кіраўнік аховы вярнуўся да іх з адказам.

- Прабачце, сіньёр. Чыпа няма. Яна яго не здала.

- Як такое магчыма? – ён безэмацыйна глянуў на яго.

- Не праверыў, сіньёр. Звычайна гэтым займаецца …

Джаваньні дастаў з кішэню рэвальвер. Ён спыніў яго руку.

- Хопіць крыві. Цяпер ужо нічога ня зьменіш. Будзем вартаваць. Мне здаецца, што ён зьявіцца хутка. Зробім так.

Ён набраў яе нумар – яшчэ раз.

На тым канцы неахвотна адказалі.

- Да.

- Слухай, давай вечарам, - вымавіў ён коратка. – Колькі? Пачуў

адказ, і зарагатаў. – Не праблема. Куды пад'ехаць? Называй адрас. Запісаў на паперы, і сунуў у кішэнь.

Сёньня з'явіцца наш госьць, абавязкова. Болей у яго шансаў ня будзе. Заўтра яна выходзіць, а сёньня – якая ўдача! І яна адсутнічае, і мяне ня будзе – доўга. Джаваньні, ты застаешся. За мужа. Толькі не злаўжывай маім даверам. Яны пераглянуліся, і рассьмяяліся.

Летыцыя напалохана глядзела на яго.

- Нічога страшнага, сонейка. Я да нашай дамы прагуляюся – не адзін. З табой, - кінуў ён кіраўніку.

- А вы з Джаваньні павячэраеце, паглядзіце кіно якое. І пачакаеце нашага госьця. Мяркую, што ён зьявіцца.

- Бардак на гэтай віле, чортавы італьянцы. Ён сплюнуў, выходзячы і садзячыся ў машыну. Габрыэль – так звалі кіраўніка аховы – сеў за руль. – Усё у іх схвачана, за ўсім яны сочаць, муха не праляціць. Трэба сваіх выпісваць. Гэтым даверу – ніякага. Усех зьмяню.

Сонца ўжо пераваліла на другую палову, але ж гэты дзень абяцаў быць бясконца доўгім.

Глава 21: Вар'ятка

- Шлюха звар’яцелая. Алекс з пагардай глядзеў на яе. – Што ты нясеш? Які Бог? Дзе і калі ты ўбачыла Бога? Ты ж зь дзяцінства на таблетках. Твая маці мне пра ўсё расказала. І як ты травілася ў школе, а потым напалохалася, і агаварыла аднакласніцу. І пра тое, што ты ў псіхушцы ляжала. Што ты Бога свайго на ўроках малявала ў сшытках, і ўвесь пакой ім завесіла. І цяпер, пасьля таго, як цябе толькі што ў дзесяцером ня трахалі, ты мне яшчэ нешта кажаш пра Бога? Пэўна, толькі яго ў цябе яшчэ не было. Ты мне схлусіла, што цябе згвалцілі. А я, як дурань, паверыў. Чалавека праз цябе ледзь не забіў. Добра, што ў свой час апомніўся. Мне ўсё пра цябе расказалі. Ты ж са школы такая была. Яшчэ плоская была, як даска, і ўжо таскалася, зусім малалеткай. Як цячная сучка. Толькі і жадала, каб цябе трахнулі. Выстаўлялася перад усімі. Каго ні запытай – усе скажуць, што ты – вар’ятка. Шлёндра. Па табе ж бачна, што ты хочаш. Усюды, усіх, і кожнага.

Ён схапіў яе за падбародак, і ўзьняў твар. Яе заплаканыя вочы глядзелі на яго. Прыгожы твар, такі, што страшна. І сапраўды страшна за сваю душу. Што яна робіць зь ім? Ён жа і праўда заб’е дзеля яе. Як ледзь не забіў. Добра, што пагаварыў з пацанамі за кружкай піва, і яму ўсё растлумачылі. Ён калі адключыўся, яна сама на кухню прыйшла. Сядзела там у празрыстым халатыку, каньяк піла. А потым, калі ёй прапанавалі, не адмовілася. парэзалася яна сама. Ляжала на стале, і барадой нож задзела, калі галаву павярнула. І давала ва ўсе месцы, і ў рот, і ў задніцу, і куды трэба. Яна ж любіць гэта, і сапраўды. Калі яна яму адмовіла? Не было такога месца, дзе б ён не адымеў бы яе, калі б захацеў. Яна ж сама распраналася, ахвотна, у кампаніі зь ім таскалася, насалоджвалася тым, як на яе глядзяць. Ёй яго аднаго мала было, гэта ж бачна. Німфаманка, шлёндра, істэрычка. Толькі чаму ён так кахае яе, як шалёны? Як нікога ніколі не кахаў? Кахае гэтую дурную шлёндру, якая рассоўвае ногі перад усімі, якая ня мае ні чэсьці, ні годнасьці. Яна ж адразу яму аддалася, у першы вечар, нібыта так і трэба. І хоць была, як высьвятлілася, цнатлівая, ды вопыту

ў яе хапала. Па ёй было бачна, што яна яго хоча, як жанчына, і вядзе сябе вольна, і не палохаецца нічога, не саромееца. Яна нават не супраціўлялася, не крычэла, калі ён яе там, у парку, зaціснуў. Адразу ёй пад майку палез – праверыць, як адрэагуе. Калі б дала яму поўху, ці закрычэла, то было б ясна, што нармальная. Прыстойная. А так яму ўсё адразу стала зразумела. Ён мог бы яе там жа, у парку заваліць, хай скажа яму вялікі дзякуй. Трэба было б так і зрабіць. Выебаць яе па п'яні, і даць пінка пад зад. Хай коціцца. Не, у хату да сябе прывёў. І ўліп у яе, як у смалу. Толькі і думаў аб тым, як яе трахнуць – павычварнее. І нічога яго не задавальняла. Як ён яе не паварочваў, што і куды не ўстаўляў, а ўзяць поўнасьцю ня мог. Быццам бы ў яе у похве бездань нейкая раскрытая. Усё вузкае, шчыльнае – хер ня ўсунеш, але ж калі пачнеш ебать яе, нібыта правальваешся, нібыта засмоктвае кудысьці. І выліваешся, і думаеш: а за гэтым яшчэ нешта ёсьць, можна ж яе далей, глыбей узяць, больш поўна, мацней, яна ж жадае гэтага, засмоктвае сваімі бяздоннымі вачыма, ляжыць пад ім, як мяртвячка, быццам бы кагосьці чакае – другога, не яго. Быццам бы ён яе поўнасьцю задаволіць ня можа, хоць яна і крычыць, і стогне, і вільгаць зь яе цячэ, і ён жа не малалетка які няўмелы, у яго ўсё у парадку, і якіх толькі жанчынаў у яго не было – усе былі давольныя, ніхто ня скардзіўся.

Пад каго ён яе не паложа, яна лажыцца. Як скажаш, так і дае. І сапраўды, толькі Бог яе ня меў. Ці – меў? Можа, толькі Бог і можа яе задаволіць? – падумалася яму.

- Скажы, трахаў цябе твой Бог? – з пагардай запытаў ён яе.

- Трахаў, - спакойна адказала яна. – Увесь час. З самага дзяцінства. Бог прыходзіў да мяне, і меў мяне – так, як жадаў. І гэта было для мяне шчасьцем, бо толькі яму я належу, і болей – нікому. Толькі Бог мае права трахаць мяне, Алекс. Нікому зь людзей я ніколі не аддавалася сама. Вы ўсе гвалцілі мяне. І маё цела, і маю душу. Толькі Богу я аддавалася праз сваё каханьне, і ён браў мяне з найвялікшай любоўю, на якую здольны толькі ён. Таму, прашу, адпусьці мяне. Адпусьці мяне да Бога. Я хачу толькі яго, і ні зь кім іншым я ня буду.

- Гэта ён – твой Бог? Мужык гэты барадаты, якога мы ў лесе

сустрэлі? Гэты цыган? Ты што – зусім ку-ку? А можа, ты зь ім ужо? Было, ці не? Прызнавайся! Ён схапіў яе за плечы.

- Было. Было ў мяне дома. І ў яго. І цяпер я пераязжаю да яго. Проста хачу, каб ты ведаў.

- А маці твая ведае? – запытаў ён. – Як яна, адабрае? Старога мужыка ў зяцьці?

- Мая маці мной не кіруе. Я ўжо дарослая. Мне амаль дзевятнаццаць год. Яна неадрыўна глядзела на яго.

- Алекс, дай мне сабраць рэчы, і я сыду. Навошта я табе? Яна правяла рукой па шчацэ. Ён схапіў яе за руку.

- Стой. Калі пойдзеш, то давай разьвітаемся.

Ён хлопнуў яе па шчацэ. Ня сільна. Яна войкнула. Дастаў з джынсаў рэмень. Апракінуў яе на канапу, і ўдарыў па заду. Яна ўскрыкнула. На ягадзіцах успыхнула барвовая паласа. Ён нахінуўся, і прыціснуўся да яе вуснамі, прыдавіў яе да канапы усім целам. Яна не вырывалася, толькі ўсхліпвала. Ён дастаў свой прыбор, і ўсадзіў яго ёй між ягадзіц – па самыя муды. Яна закрычэла, і паспрабавала вырвацца, але ж ён яе трымаў. Трахаў яе доўга, пакуль ня сконьчыў – ледзь сэрца не спынілася.

- Гэта табе на памяць, - вымавіў. - Шлёндра. З сілай шлёпнуў яе па задніцы, плюнуў, зашпіліў штаны, накінуў куртку, і пайшоў.

- Тата, - прашаптала яна. – Татачка, дзе ты? Ці ты чуеш мяне? Госпадзі? Бог мой. І раптам адчула на сабе яго руку. І прачнулася.

Джаваньні сядзеў ля яе ў цемры, і глядзеў на яе кашачымі вачыма. Была глухая ноч. І ў ваннай паварочваліся цяжкія дзьверы.

- Слушай, как задолбал её скулёж! Блядь, она ни о чём думать больше не может, кроме того что её по-всякому ебали. В её понимании, конечно, насиловали. А как же ещё! Она ж святая!

С Богом на короткой ноге. Такую только насиловать можно. То, что она сама шлюха, каких свет не видал, извращённая донельзя, ей в голову не приходит. Я б ни одному мужику себя не позволила в задницу трахнуть. Да не то, что в задницу, я ещё и в рот взять подумаю. За отдельную плату!

Карына зарагатала.

- И в чём только душа держится. Что там ебать? Сорок килограммов костей. И как мужикам такие нравятся? Яна паморшчылася.

- Нравятся таким извращенцам-педафилам, как этот, - паціснула Марыся плячамі.

- Слушай, я б её сама изнасиловала. В качестве психоанализа. Засадила б ей в задницу страпон полметровый. Чтобы она узнала – что такое «изнасиловали». Яна зарагатала.

- А хорошая идея. Карына таксама рассьмяялася.

- Прикинь, приходит она на следующий сеанс – а там уже всё готово – в стиле БДСМ, как она любит. Мы б и мужика подходящего ей нашли. Такого центнера с два. С хуём до колена.

- Нет, такой её не удовлетворит. Карына прыжмурылася. – Ей осла, или коня нужно. А что. Есть такие – для зоофилов снимаются. Слушай, продать бы её в бордель – пусть бы её кони и ослы ебали. И негры с метровыми хуями в руку толщиной. Пока её, как лягушку, не раздерут. Вот тогда она поймёт, что такое – изнасиловали. И как деньги зарабатывать нужно.

- Нет, ну тут она тоже не кисло зарабатывает. У её мужика примерно всё так и есть.

- А ты откуда знаешь? – Карына зьдзіўлена глянула на яе.

- Оттуда. Ты ж помнишь про пятьсот евро?

- А, ну да… ты что-то такое говорила. Только я подумала – это тебе за гостя дали. За групповушку. И ты там только сосала,

вроде. Ты ж сказала?

- Ну да. Я на извращения не подписывалась. Но хер у него такой, что мама моя. Так что её и конём не удивить. Только разве слоном. Слушай, может, и правда ей настоящее изнасилование организовать? С неграми? Давай, продадим её. Как-нибудь выманим из дому. Она хоть и страшная, и худая, как смерть, я б на неё и не глянула, но мужикам извращённым почему-то нравится. Не пойму даже. Я знаю чуваков – можно договориться. Подкараулить её в каком торговом центре. Или завести куда. А там уже – дело техники. Ты знаешь, за это можно несколько тысяч евро выручить. Дорогой товар. Может, и десять даже.

- Десять штук за неё? – Карына акругліла вочы. – За эту? Доходягу?

- Ну да. Бабы с опытом на рынке рабов дорого стоят. А эта – ещё и опытная «девственница». И верующая. И шизанутая. Для особо богатых извращенцев. Чтобы они её на куски порезали на камеру. Прикинь, что она нести будет – какую дичь. Такое ж не сыграешь. А тут пиздец без грима.

Марыся зарагатала. Сьмяялася доўга, так, што прахожыя паварочваліся.

- Слушай, а как у тебя дела с этим твоим, хорватом? – запытала яна Карыну нарэшце.

- С сербом? Как? Ну, так. Нормально. Не трахались ещё. Но – собираемся. Он ко мне сегодня вечером прийти должен. Ой, как раз время! Ты извини, подруга, мне бежать нужно. Ванну с солями принять.

Марыся ўсьміхнулася.

- Ты смотри, осторожней там со своими солями. А то откинешся когда-нибудь в ванной.

- Не откинусь. Чего ты? Карына зьдзіўлена глянула на яе.

- От лаванды ещё никто не помирал, подруга.

- А … ну-ну. А то я подумала. Марыся ўстала, шчоўкнула засьцёжкай сумачкі, і яны разьвіталіся. Толькі яна і не ўяўляла, што назаўсёды.

Глава 22: Змова

На наступны дзень Карына не пазваніла, і не адказала. Да абеду яна думала, што, пэўна, сьпіць. Пасьля ж абеду тэлефон і наогул стаў недасяжны. Нешта такое заскрэблася ў ёй – дзіўнае. Здаецца, чаму хвалявацца. Толькі нешта ўсё ж непакоіла яе. Нейкі стрёмны гэты мужык. Хто ён? Яна казала, што ветэран. Што ваяваў. А яны – усе ебанутыя. Можа, прыбіў яе дзе. Быццам бы ў пацьверджаньне яе трывожных думак, зазваніў тэлефон.

Яна глянула нумар.

Карына.

- Ну, что ты там? Проснулась, соня? Как ноч прошла? – запытала яна ў трубку кпліва, але ж радасна.

- Здравствуйте, - пачуўся ў адказ мяккі, нізкаваты, аксамітны мужчынскі голас. Такі, што ад яго па сьпіне ў Марысі пабеглі мурашы.

- Здравствуйте, - адказала яна, і замаўчала.

- Вы – Марина? – запытаў ён.

- Я. Яна памарудзіла з адказам – не магла зразумець, што адбываецца.

- А где Карина? – нарэшце, запытала яна.

- Карина, к сожалению, пропала. Я не знаю, где она. Вы знаете, вчера, когда я пришел, она была какая-то неадекватная. То ли пьяная, то ли ещё что-то. А потом ей позвонили, и она извинилась, и ушла. Сказала, что сейчас будет. Я ждал её, ждал. Уже волноваться начал. Но она так и не появилась. Понимаете, мы по делу встречались. Не по тому, о чём она, может быть, подумала. Ванна эта, бельё. Вы знаете, я – деловой человек. И у меня просто было к ней предложение. Она вхожа в один дом, где, как я узнал, она оказывала услуги

психоаналитика одной девушке. Не буду скрывать, у меня есть интерес, и можно заработать. Карина сказала, что вы тоже работаете в этом доме, и по разговорам я понял, что вы – более адекватная. Марина. Так?

- Да, конечно. Я более адекватная, чем эта дурочка. И, поверьте, у меня и информации побольше, и возможностей.

Яе вусны расплыліся ў шырокай вусьмешцы.

- Да, конечно, мы встретимся. Да, я готова. Прямо сейчас. Нет, всё серьёзно. Я вас правильно поняла, а вы – меня. Конечно же. Где? Хорошо.

Яна запісала назву кафе ў цэнтры.

- Ждите, я скоро буду.

- Какая удача неожиданная! – падумала яна. – Вот и правда, стоит только озвучить Вселенной своё желание, как оно начинает сбываться. Только что поговорили – в шутку, что эту дурочку нужно в бордель продать за десять тысяч евро, как опа! – Вселенная уже услышала. И покупатель нарисовался.

Мілаш з палёгкай адкінуўся ў крэсьле, у якім правёў палову бяссоннай ночы. Гэтая дурная шлёндра с кучарашкамі раптоўна сарвалася, і пабегла некуды, як ашпараная. Нумар, які застаўся апошнім у яе тэлефоне, быў схаваны. Але ж яна адразу адказала на яго. Бачна, што ведала, хто можа зь яго званіць.

Сказала, што хутка прыйдзе, аднак час ішоў, і яе ўсё не было. Ён чакаў і чакаў у гэтай кватэры, і зусім ужо звар'яцеў – ад нецярплівасьці і злосьці. Нітачка, якая была ў яго руках, парвалася, пераўтварыўшыся з трывалага, прочнага канату ў павуцінку, а потым – у цень, якая проста растала ў паветры.

Ён павінен зрабіць яму гэта – тое, што яму зрабіў ён. Праз яго загінула яго сястра. Яго родная кроў. Ён не жадаў яе забіваць – так атрымалася. Калі даведаўся, што яна таскалася з гэтым, клятым басьнійцам, чорным, як чорт, брудным, зарослым барадой і валасамі, як цыган, якія сапраўды горшыя за ўсіх, ён

не стрымаўся. Сам адправіў яе да праайцоў. Спачатку аддаў яе сябрам – хай пацешацца, насыцяць юр гэтай шлёнды. А потым – сам выебаў яе, дакладней, тое, што ад яе засталося. Яна была яшчэ жывая, і ён міласэрна перарэзаў ёй горла нажом. І выкінуў на дарогу – каб усе бачылі. І ён каб ведаў. Каб усе падумалі, што гэта зрабіў ён – той, зь кім яна таскалася. Ня можа ж такое зрабіць з сястрой родны брат. Неяк так адбылося, што сябры, якія гвалцілі яе, выпадкова загінулі. Бомба. Такое бывае. Падлажыў нехта з клятых басьнійцаў. Ня мог жа ён не адпомсьціць ім за сваю сястру. Усім ім. Толькі вось, ня здолеў адпомсьціць самому сябе. І ўсё – праз яго. І цяпер ён, Мілаш, мучаецца, а гэты жыве. Ён цкаваў за ім – доўга. І вось знайшоў. Стаяў перад варотамі вілы, і глядзеў зь ценю.

Пад'ехала машына, і зь яе выйшла – яна.

- Мілка. Ён ледзь ня кінуўся да яе. Яе валасы, чорныя, як ноч, ліліся па плячах. Скура была белай, як сьнег. Такая ж высокая і танюткая, як трасьцінка. Яна была жывая? Як? Гэта ж было не магчыма. Колькі год ужо прайшло – а яна такая ж, як тады. Аграменныя празрыстыя вочы – шэрыя, у якіх адбіваецца блакіт нябёсаў, чорныя тонкія бровы дугамі, як крылы вялікай птушкі, мяккія ружовыя вусны, лёгкая постаць, тонкія рукі, маленькія кісьці. Яна была як цень, як прывід. Як анёл, не належачы гэтаму сьвету. Якім была і яго сястра.

А побач з гэтым анёлам шоў д'ябал. Чорны, высокі, зарослы барадой, з грывай чорных, як смала, валасоў, перахвачаных нядбайна ў хвост. Ён. Яго Мілаш адразу пазнаў. Гэта з-за яго яна адмовіла яму.

Яго бацькі вырасьцілі яе, як яго родную сястру. Удачарылі, і яна ні ў чым і ніколі ня мела адказу. Яны яе песьцілі, балавалі. І ён яе балаваў. Насіў на руках. Рабіў для яе значна больш, чым брат бы зрабіў для сястры. Прадугадваў кожнае яе жаданьне. Бо яна была яму болей, чым сястра. Яна была чыстай. Сьвятой. А пела як – як анёлак. У хоры пела, у храме. Ён думаў, яна аддасьць сябе Богу. Усе думалі, і таму ён яе не кранаў. Толькі марыў пра гэта, але ж нават і ўявіць баяўся. І вось, ён даведваецца, што яна сьпіць з гэтым. З прыдуркам з акраіны, зь нейкага там іх вахабітскага паселішча. Ён ня верыў, але ж прасачыў – людзі

казалі, і ўжо папаўзьлі чуткі. І тое, што ён убачыў, навечна перавярнула і яго розум, і яго жыцьцё. Ён нават і успамінаць аб гэтым не хацеў. Яго сястра – сьвятая, анёлак, да якой ён і пальцам дакрануцца баяўся. Толькі далей адбылося яшчэ больш нечаканае, што ён наогул і ўявіць ня мог. Ён думаў, што яна вернецца дамоў, а яна сышла – зь ім. Так і сышлі разам. Нават не павярнуліся.

Яго сям'я пакрылася пазорам, ён хадзіў, як у ваду апушчаны. Але ўсё ж, ім спачувалі. Колькі разоў яны зьбіраліся разам, і клялі гэтых праклятых здраднікаў, прадаўшых туркам веру за грошы, і панаваўшых над імі столькі год. Добра, што чакаць прыйшлося нядоўга. Тое, што павінна было выбухнуць, выбухнула. Нарэшце пачалася вайна.

Яны здолелі выкрасьці яе. Адвесьці ў лягер, дзе ўжо ёй прыйшлося адказваць. Ня толькі перад ім – перад усім родам, які прыняў яе, як сваю, і які яна зганьбіла. Навошта ўдачаралі? Гнілая кроў. Ніхто ня ведаў бацькоў гэтага дзіця, толькі што была прыгожая, як анёл, і маці ня вытрымала, упрасіла бацьку. Так жадала дачку, толькі болей ражаць не магла. Вось і атрымала зьмяю ля сэрца. Канешне ж, яны задаволілі яе папоўнай, і выкінулі, як сьмецьце. Выкінулі на іх зямлі. Так, каб яе мог знайсьці ён. Казалі, ён выў, як воўк. Рыў ёй магілу голымі рукамі – нажом рэзаў мёрзлую зямлю. А пасьля гэтага звар'яцеў. І тое, што ён пачаў творыць, ніякімі словамі апісаць было нельга. Чорны Д'ябал. Забойца, не шкадуючы нікога. Той гвалт, які ён рабіў, быў пякельны, няўяўны. Відавочна, што ён помсціў. Але ж тое, што ён рабіў, пераходзіла мяжы помсты. Ён і сапраўды атрымоўваў ад гэтага асалоду. Яны цяпер былі паасобку. Адны, адзін насупраць другога. Сьвет вакол іх зьнік, і яны быццам бы спаборнічалі ў жорсткасьці і апантанасьці. А потым усё раптам спынілася. Ён зьнік, быццам бы яго і не было. Кольці год ён яго шукаў! Ведаў, што такі чалавек так проста зьнікнуць ня можа. Што ён абавязкова зьявіцца, і ізноў возьмецца за старое. Так і адбылося.

Калі ён сядзеў насупраць яе, гэтай яго жанчыны, ён нічога б ёй ня змог зрабіць. Акрамя аднаго – ён жадаў забраць яе. Адматаць час назад. Вярнуць усё, як было. Як яно было да гэтага

чалавека. Ён гаварыў зь ёй, і разумеў, што ён яе кахае. І кахае так моцна, што ў яго сэрца гатовае выпрыгнуць з грудзей. Яму хацелася паўстаць перад ёй на калені, і прасіць прабачэньня за ўсё зробленае. Ён быў у гэтым ня вінаваты. Вінаватая была вайна.

Ён апусьціў галаву ў рукі, і, пэўна, задрамаў. І вось, прачнуўся. Карыны не было, а перад ім ляжаў і званіў яе тэлефон.

- Марина Михал, - прачытаў ён.

Канешне ж, яны павінны сустрэцца. Гэта сам Бог прывёў яму яе, каб ён меў магчымасьць адпомсьціць. Бо Бог – на яго баку. Ён заўсёды гэта ведаў – што ўсё, што ён робіць, было па волі яго, і дзеля яго славы. І цяпер Бог сам вядзе яго да помсты, дапамагаючы яму – яго ўласны, адзіны ісьціны Бог.

Глава 23: Семя

- Вайна – гэта заўсёды індульгенцыя на гвалт, Джаваньні. Ты робіш тое, чаго б ніколі ад сябе не чакаў у мірным жыцьці. І, ведаеш, гэта ап'яняе. Гэта нібыта ў цябе выросьлі крылы, і цяпер ты можаш назіраць зямлю зь неабсяжнай высаты. Зь нябёсаў. Бо сапраўдны выток гвалту – ня пекла, а боскасьць. Толькі Бог можа рабіць забароннае, і пры гэтым не зьнішчаць самое сябе. Я прайшоў праз зямлю, праз пекла. І праз нябёсы прайшоў. І зразумеў усё - як яно працуе. Як віруюць у неабсяжнасьці патокі крыві, і як яны ліюцца праз неба на зямлю чырвоным дажджом. Зразумеў таямніцы болю, і тое – што яны, адначасова, і таямніцы каханьня. Боль – найвышэйшая ахвяра, а Бог – ахвяруючы. Ён прычыняе боль самому сябе, катуючы свае стварэньні, і толькі праз гэта ён жывы. Бог ажывае, амыты патокамі крыві – і Боль пераўтвараецца ў Радасьць. Як лічыш, пазбавіцца дзявоцкасьці, прыняць у сябе мужчыну для жанчыны гэта асалода, ці боль? А нарадзіць дзіця – плод асалоды? Ці – плод болю? Ці ёсць розьніца паміж асалодай і больлю душы, калі яна таміцца ад каханьня, і гатовая разарваць цела, бо яно ня можа ні ўмесьціць, ні зразумець усю моц яе пачуцьця? Ты калі-небудзь гвалціў жанчыну, якую кахаеш? Кахаеш бязь меры, як Бога, як Дзеву Марыю?

Разрываў на ёй адзеньне, браў яе сілай? Уваходзіў у яе прыродным, і супрацьпрыродным спосабам? Чуў яе крыкі болю, а потым – стогны, калі, зьнясіленая, яна скаралася цябе, і яе боль пераўтвараўся ў асалоду, якая ўзьнімала цябе на нечалавечую вышыню, туды, где нават і дыхаць нечым, дзе ёсьць толькі ты, і яна, бясконцасьць, і Бог?

- Браў. Браў менавіта так, як ты гаворыш, Мікеле. Я ж згвалціў сваю сястру. Узяў яе, да таго, як яе ўзяў мой айцец. А потым я забіў айца. У нашай сям'і была традыцыя – айцец браўся шлюбам са сваёй дачкой, і нараджаў сына, які потым таксама рабіў тое ж. Чысьціня лініі. Мая маці была мне адначасова і сястрою, хоць я і выйшаў зь яе ўлоньня. Права на маю ж сястру мелі мы абодзьва. Гэта складана, але ж менавіта так устроены

наш род. Айцец мае права на дачку, брат – на сястру. Такімі чынам, толькі жанчынаў мы бярэм чужых. Ніхто ж з чужых мужчын у нашу сям'ю не ўваходзіў. Гэта – найчысьцейшая кроў, якая не перарывалася, не размывалася з даўніх часоў. Толькі жанчыны могуць быць розныя. Мужчыны ж маюць толькі аднаго мужчынскага продка.

І, ведаеш, ніколі ў нашай сям'і не было ніякіх адкланеньняў, заганаў са здароўем, хоць мы ўсе – дзеці аднаго агульнага айца. Гэта таму, што, як кажа легенда нашаго рода, першы з тых, хто залажыў гэтую традыцыю, быў Богам. Кроў чалавечая даўно б ужо сапсавалася. Але ж толькі Бог можа нарадзіць дасканаласьць ад самога сябе.

Складана, і, разам з тым, проста.

- Я разумею. Міхась кіўнуў.

- Летыцыя – мая дачка. А да гэтага маёй жонкай была мая сястра. Толькі яе забралі ў мяне. Забралі, і забілі. Жорстка. Згвалцілі, можа, у дзясяцером, калі ня болей. Проста парвалі на кавалкі. Мілаш хацеў заявіць свае правы на яе. Так здарылася, што яна трапіла ў прыёмную сям'ю, і яны вырасьлі разам. Наша традыцыя – старая, і яна ідзе здаўна. Сапраўды, гэта так.

- Тое, што ты расказаў мне, пацьвярджае, што мы з табой – аднаго роду. Адной крыві.

- Так. Міхась кіўнуў. Гэта значыць, што ў нас адзіны агульны продак – Бог, Джаваньні. Толькі ты ня ведаеш усех таямніцаў, якія ведаю я. Так адбываецца, што айцец-Бог нараджае сына двойчы. І адзін з сыноў пры гэтым нараджаецца Богам, а другі – Д'яблам. Твой айцец нарадзіў цябе, і яму патрэбна было нарадзіць яшчэ аднаго сына. Бо ты, Джаваньні, ты ж ведаеш хто ты. Але ж ты забіў свайго айца. Цяпер ваш род пазбавіўся Бога, і ў ім застаўся толькі Д'ябал. Бог жа вам патрэбны, каб працягнуць існаваць. Бо толькі дасканаласьць Бога можа ураўнаважыць д'ябальскую старану. Без такога дзіця ваш род, ня маючы заганаў зьнешне, будзе несьці ў сабе адзін страшэнны заган – прага насільля, крыві ў ім будзе станавіцца ўсё большай і большай. І ўсё цяжэй будзе спраўляцца з гэтым. Я сам,

Джаваньні, цяпер ня ведаю, хто я. Бог, ці Д’ябал. Каін, ці Авель. Усё пераблытана, бо мая лінія таксама некалі перарвалася.

- А можа, ты – Сіф? Джаваньні зь цікаўнасьцю глядзеў на яго. – Ведаеш, легенда кажа, што трэцьцяе дзіця будзе самым дзівосным дзіцём – Сынам Чалавечым, які з’яднае ў сябе і Бога, і Д’ябла.

- Чалавеку не дано ведаць, хто ён, Джаваньні. У кімсьці з нас – семя Д’ябла. У кімсьці – семя Бога. Толькі яна ведае. Шхіна. Яна ніколі не народзіць ад Д’ябла па сваёй волі. Заўсёды будзе шукаць, і прагнуць Бога. Мая каханая кажа мне, што я – Бог.

- Значыць, гэта так і ёсьць. Джаваньні кіўнуў. – Толькі гэта не азначае, што ў табе няма Д’ябла, ці яго семені. Яно проста сьпіць, Мігеле. І можа адбыцца так, што яно прачнецца.

У цемры яна пачула мужскія крокі. Джаваньні прыціснуў палец да вуснаў, і пасунуўся назад, у цемру, якая адразу праглынула яго. Ён стаяў за ёй, як нячутная і нябачная прысутнасьць, так ціха, што яна і сама пачала сумнявацца, ці тут ён, ці не. А можа, ён і сапраўды кудысьці зьнік, і пакінуў яе адну? Цяпер перад ёй была толькі цемра, і цемра стаяла за ёй. І ў гэтай цемры, якая пераўтварылася ў нешта, што набыло форму, яна пачула голас.

- Я прыйшоў за табой, - ціха вымавіў чалавек.

- А калі я не пайду з табой? – запытала яна.

- Пойдзеш. У цябе няма выбару. Пойдзеш са мной – жывая, ці мёртвая. Але ж я ўпэўнены, што ты пойдзеш жывая. Як ты зможаш супрацьстаяць мне? Я магу зрабіць з табой усё, што пажадаю. Ты поўнасьцю ў маёй уладзе. Я тут, блізка. Хочаш – працягні руку, і дакранешся да мяне. Яна працягнула руку, і сапраўды сустрэла нешта, што нагадвала біцепс мужчынскай рукі. На ім яе пальцы адчулі груба зашыты шнар. Яна судрыгнулася, уявіўшы, якая рана магла пакінуць яго. Напэўна, чалавеку разарвала ўвесь немалы мышачны слой да самай касьці. Боль, пэўна, быў жудасны. Яе пальцы памарудзілі імгненьне.

- Мне не было страшна ці балюча. Я наогул нічога не адчуваў – кантузія. Потым – да. Балела страшэнна. Але ж я сустракаўся з гэтым болем толькі ноччу. Днём быў заняты – не да таго было.

- А чым вы былі заняты днём? – запытала яна, проста, каб працягнуць час. Каб адцягнуць гэты момант, за якім паўставала для яе невядомае.

- Вайной, - спакойна адказаў голас. – Паляваньнем на людзей. Гвалтам. Рабаўніцтвам. Забойствам. Растрэламі. Шмат чаго было трэба рабіць.

- Навошта вы рабілі ўсё гэта?

Яе голас задрыжэў.

- Вайна, - проста адказаў голас зь цемры.

- А што вы зробіце са мной, калі вы забярэце мяне? – ціха запытала яна.

- Адвязу цябе ў Белград. Я даўно шукаў цябе. З таго самага дню, як цябе забіў, - проста адказаў голас.

- Як вы забілі мяне, калі я – жывая? – яна не зразумела яго.

- Гэта ты лічыш, што ты жывая. Насамрэч, ты – мёртвая, як і я. Я не вярнуўся з вайны, а ты ляжыш, згвалтаваная і зьнявечаная, недзе ў лесе. Але цяпер усё можна перагуляць нанова. Я не забіў цябе, і не памёр. І ты ізноў побач са мной. Няўжо ты ня хочаш вярнуць усё, як было, Мілка? Прабачыць мяне, свайго брата? Я ж твой брат. Ці ты забыла? Пэўна, гэтая цемра зусім закрыла табе вочы.

- Я – ня Мілка. Вы памыляецеся, - ціха вымавіла яна. – Нельга вярнуць мінулае.

Раптам ёй стала яго шкада. Гэты чалавек, відавочна, быў вар’ятам.

- Навошта вы забілі Карыну? – запытала яна яго.

– Карыну? Я яе не забіваў. Гэта зрабіў твой муж. Яна хутка сышла некуды, пасьля званку, і не вярнулася. Ты ведаеш, на што ён здольны?

- Да, - ціха вымавіла яна. – Я ведаю. Аднак гэта нічога не мяняе. Я кахаю яго, якім бы ён ня быў.

- Яму пашанцавала, - нягромка вымавіў голас. – Час ужо выходзіць. Пайшлі. Ён устаў, і зрабіў крок да яе.

Выстрал прагучэў нечакана, раздаўся ўскрык, і разам зь ім успыхнула сьвятло. Ліхтарык высьвятліў сагнутую папалам фігуру, якая трымалася за рэбры. З-пад пальцаў чалавека бегла густая чорная кроў.

- Нечакана? Джаваньні націснуў кнопку начніка на стале. Цяпер у паўзмроку была бачная яго постаць – чорная, у чорным на фоне чарнаты.

- Хто ты? – запытаў зьдзіўлена чалавек.

- Твая сьмерць. Якая табе розьніца, хто я? Лічы, што я – анёл сьмерці, і прыйшоў за табой. Ты не заберыш яе. Яна табе не належыць. Таму што яна належыць нам. Усім нам. Яна – жонка Ўладара. І мая сястра. Падобныя мы, як лічыш?

- Як ноч і дзень, - прахрыпеў чалавек, змагаючыся за жыцьцё, якое хутка выцякала з-пад яго пальцаў.

- Яна не твая. Ты прыйшоў вызваліць яе, але ж ты нічога ня ведаеш. Нікому не забраць у Госпада тое, што яму належыць. І ён палажыў на яе руку сваю, і будзе трымаць яе на ёй усю бясконцасьць часу. Хутка ў чалавеку абудзіцца Дракон. І калі Дракон з’яднаецца з Богам, сусьвет спыніць сваё існаваньне, і тады будзем вызвалены мы ўсе. Дзякуй табе за тое, што ты дапамог нам абудзіць Дракона, які ўжо асэнсоўвае сваю сапраўдную моц. Карына – гэта толькі пачатак. Усяго баранкаў павінна быць трынаццаць. І калі апошні зь іх будзе ахвяраваны, Дракон зможа набыць плоць, і поўнасьцю выйсьці зь цемры.

Чалавек закачаўся, захрыпеў, намагаючыся вымавіць нешта, але

ж апошні выстрал – у галаву – перарваў яго словы.

- Досыць, - спакойна вымавіў Джаваньні.

- Досыць глядзець гэты бязглузды сьпектакль. Вар'ят адыграў сваю роль, і сказаў сваё апошняе слова. Як вы сябе адчуваеце, прыгожая донна? Прабачце за тое, што ўсё гэта адбылося на вашых вачах. Сьмерць – відовішча, якое не павіна бачыць жанчына.

- Я не баюся сьмерці, Джаваньні, - ціха вымавіла яна. – Бо яе наогул няма. Сьмерць – гэта толькі пераход паміж целамі. Я гэта ведаю, так жа, як гэта ведае і ён. Я памірала ўжо шмат разоў. І ён таксама шмат разоў памераў.

- І я. Джаваньні кіўнуў. – Чаму мы ня можам вызваліцца, прыгожая донна? – раптам запытаў ён яе.

- Навошта, Джаваньні? Мы і так вольныя. Яна падышла да яго, і ціха абняла. Ён сьхіліў ёй галаву на плячо.

- Я стаміўся, - ціха вымавіў ён.

- Нічога, - прашаптала яна. – Жыцьцё і сьмерць – толькі сон. Ён любіць цябе, Джаваньні. І ён – тут, з намі побач.

Глава 24: Дрэва

- Не чакала?

Ён сеў у крэсла, закінуўшы ногі на стол. Дастаў цыгарэту, і закурыў.

- Отчего ж? Ждала. Яна таксама апусьцілася ў крэсла насупраць.

- Усё зрабіла, як я казаў? – запытаў ён яе.

- Так. Ключ яму дала, і сказала, што бясьпечна.

- І ты думаеш, пасьля гэтага ты будзеш жыць? Ён зацягнуўся.

- Што я прабачу табе тваю здраду?

- Вы обещали, Михаил. Я прошу вас. Я не хотела вас предавать.

- Не жадала, але ж прадала. Я пусьціў цябе ў свой дом. Даверыў табе сваю жонку – самае каштоўнае, што ў мянё было. І ёсьць. Ён выпусьціў у яе дым.

- Прошу вас. Не нужно. Яна паўстала з крэсла, пяцячыся.

Ён падняўся, і штуршком пасунуў канапу, стаяўшую збок, поперак дзьвярэй.

- Хадзі сюды, - проста вымавіў ён. – Ты ж жадала майго каханьня. Зараз ты яго атрымаеш у поўнай меры. Насыцішся мною аж да сьмерці.

Яна яшчэ абдымала Джаваньні, калі ў яго кішэні зазваніў тэлефон.

- Джаваньні, гэта я. Я скончыў. Можаш прыязжаць. Баранак падрыхтаваны і асьвежаны.

Джаваньні кіўнуў.

- Зараз буду, Мігеле.

- Прыўкрасная донна, паедемце. Прагуляемся. Апраніце нешта прыгожае, сёньня такая цудоўная ноч. Ён пацягнуўся.

Яна моўчкі падышла да шафы, адкрыла яе, і выбрала доўгае чорнае плацьце са шлейфам – бліскучае, як начное неба.

- Гэта падыйдзе, Джаваньні? – запытала яна яго.

- Падыйдзе, донна. Вы ў ім – сапраўдная каралева ночы.

- Дзякуй. Яна апранулася, расчасала шчоткай валасы – па пакоі паліўся духмяны салодкі водар – пах ружы, ванілі і мёртвага цела, як здалося яму.

- Пэўна, гэта кроў запяклася, і пачынае пахнуць, - падумаў ён. – Нічога. Заўтра ўсё уберуць, і сьлядоў не застанецца.

Ён працягнуў ёй руку, і яны апусьціліся па ступеньках – у цемру.

Яна абняла яго, прыціснулася да яго шчакой, дачытваючы эпілёг.

- А чаму – “Дрэва”, каханы? – запытала яна яго.

- Таму што “Баранак” ужо быў, і ахвяра ўжо была. І наогул, я не майстар дэтэктываў, любая. Ты ж ведаеш, я болей пра другое. Яна пацалавала яго.

- Мне было дужа цікава, ты нават не ўяўляеш! Столькі ўсяго – і Мілаш, і Дракон, і тайны ход, і ўсе мы тут. Мне было сапраўды страшна, ведаеш?

- Ну чаго табе было страшна? Ён пацалаваў яе. – Золатка маё. Праўда думаеш, атрымалася ня блага?

- Праўда.

- Толькі шкада, што выдаць гэта нельга. Знаеш, калі я вісеў на Дрэве, на крыжы – я і сапраўды яго ўбачыў. Убачыў Д’ябла. Ён стаяў, захінуты капюшонам. І тады я падумаў, што ён цкуе за мной. Пэўна ж, я яго даўжнік. Але там, на крыжы, усе мае даўгі былі выплачаны, і ён цяпер бяссільны забраць нешта ў мяне. Можа толькі назіраць здалёк.

- Ты перамог д’ябла ў самім сабе. Яна пацалавала яго.

- А ты жорсткі. Такое зрабіць з Карынай. І з Марысяй таксама.

- А што такога? Яны заслужылі і не такія катаваньні. За цябе. Проста я ім крышачку адпомсьціў. Не забіваць жа мне іх было сапраўды. Вось, выпусьціў пару. А ты – мая каралева ночы. Ён пацалаваў яе.

- Нават ня ведаю, будзе ў мяне яшчэ адзін сеанс псіхааналізу з псіхолагам-эзатэрыкам. Яна ўсміхнулася.

- Калі захочаш, будзе, любая. Насамрэч – дурасьць, на жаль ці на шчасьце, не караецца сьмяротным пакараньнем.